ГОСУДАРСТВЕННАЯ ПУБЛИЧНАЯ БИБЛИОТЕКА
Москва, Б-ка ВСНК СССР Янв.-дек. Зъв.-17

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗВЯЗДА

Орган Цэнтральнага камітэта камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XIV
№ 285 (3884)
ПАНЯДЗЕЛАК, 8 СЬНЕЖНЯ 1930 г.

Цана нумару 5 кап.
Выходзіць штодзённа за выключэньнем чацьвяргоў

Прыгавар пралетарскага суда над агентурай інтэрвэнтаў

МАСКВА. (Па радыё ў гадзіну ночы). 7-га сьнежня пасьля 36—гадзінай нарады спэцыяльнай прысутнасьці Вярхоўнага суда СССР вынесен прыгавар па справе контр-рэвалюцыйнай арганізацыі—„прампартыі".

Прыгаварам спэцыяльнай прысутнасьці Вярхоўнага суда прысуджаны: РАМЗІН, ЛАРЫЧАЎ, ЧАРНОЎСКІ, КАЛІНЬНІКАЎ, ФЯДОТАЎ да вышэйшай меры сацыяльнай абароны—расстрэлу з канфіскацыяй усяе іх маемасьці.

Падсудныя—КУПРЫЯНАЎ, ОЧКІН І СІТНІН прысуджаны да 10 год пазбаўленьня свабоды кожны са строгім адмяжаваньнем, з канфіскацыяй маемасьці і паражэньнем у правох тэрмінам на 5 год кожны пасьля адбыцьця пакараньня.

Прыгавар канчатковы і абскарджанню не падлягае. Прыгавар спатканы бурнымі апладысмэнтамі перапоўніўшай залю публікі.

Узмацнім пралетарскую пільнасьць да дзяржапарату

Дзяржаўны апарат зьяўляецца моцнай зброяй у руках рабочае клясы, якая пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі будуе сацыялізм. Тав. Ленін ня раз падкрэсьліваў гэтую ролю дзяржаўнага апарату. Уладзімер Ільліч пісаў: «Без апарату мы-б даўно загінулі. Бяз систематычнай і упартай барацьбы за паляпшэньне апарату мы загінем да стварэньня базы сацыялізму». Іменна таму клясавы вораг, бюракрат і шкоднік робіць усё, каб аслабіць апарат, каб падначаліць пэўныя зьвены нашага апарату інтарэсам кулака і інтэрвэнта. Іменна таму Рамзіны, Ларычавы, Кондрацьцевы і Романовы прадзялі на камандныя вышыні нашага савецкага апарату, каб адтуль ажыцьцяўляць свае інтэрвэнцкія плёны. З гэтай-жа прычыны контр-рэвалюцыйныя беларускія нацыянал-дэмакраты імкнуліся аўладаць камандкімі вышынямі у Наркамземе, Наркамасьвеце і г. д., каб пры дапамозе гэтых апаратаў праводзіць сваю кулацкую і нацыянал-фашысцкую праграму, каб забясьпечыць ажыцьцяўленьне плянаў інтэрвэнцыі.

У дапамогу клясаваму ворагу ў яго барацьбе за аўладаньне савецкім апаратам ашурушнікі з права-«лявацкага» блёку распаўсюджваюць хлусьню аб нашым савецкім апараце, што ён, быццам, зне прыстасаваны да задач, высунутых перад ім рэканструкцыйным пэрыядам» (Ламінадзе), што барацьба за паляпшэньне апарату «садзейнічае ўзмацненьню бюракратызму» (Сырцоў), тым самым імкнучыся дэмаралізаваць увагу рабочае клясы да змаганьня за сапраўднае паляпшэньне дзяржаўнага апарату, за далейшае адточваньне гэтай моцнай зброі ў барацьбе за сацыялістычнае будаўніцтва супроць інтэрвэнтаў і шкоднікаў.

Той факт, што мы ня толькі выкавалі за першыя два гады пяцігодкі намачэнкі нацыянальнага плану, але, што мы іх у асноўных вучастках народнае гаспадаркі значна перавыканалі, як нельга лепш абвяргае хлусьню і паклёп прэса «змяновіцкіх» апартуністаў. Хлусьней зьяўляецца цьвярджэньне, што наш апарат не прыстасаван да ўмоў рэканструкцыйнага пэрыяду. Упартае змаганьне партыі і усёй рабочай клясы за паляпшэньне апарату, за яго арабочаньне, за ушчыльненьне выроких мас працоўных у яго работу—падначаліла гэты апарат задачам сацыялістычнага будаўніцтва, спрыяла таму, што мы маем вялізарныя посьпехі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Разгорнутае сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце выклікае шалёнае супраціўленьне клясавага ворага. Клясавы ворог імкнецца ўсімі сіламі нашкодзіць нашу сацыялістычнае будаўніцтва. **Мабілізацыя творчай ініцыятывы працоўных мас супроць бюракратызму нашых устаноў зьяўляецца адным з важных элемэнтаў сацыялістычнага наступленьня.**

Факты бюракратызму, самастраховкі, ухіленьня ад адказнасьці за выкананьне вырокіў партыі і ураду, адставаньне вясковых зьвенняў нашага апарату від тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва сьведчаць аб тым, што яшчэ ня ўсе кіраўнікі нашых устаноў, ня ўсе нізавыя партыйныя і прафэсыянальныя ячэйкі савецкага апарату зразумелі ўсё палітычнае значэньне нашай барацьбы за паляпшэньне апарату, асьцярогі яго ад бюракратычных, клясава-варожых і шкодных элемэнтаў, не зразумелі таго, што «барацьба партыі і саветаў з бюракратычнымі скажэньнямі ў дзяржаўным апараце... становіцца адной з важнейшых форм клясавага змаганьня» (XVI партканфэрэнцыя).

У гэтым змаганьні наша партыя, мабілізуючы шырачэзныя масы рабочай клясы пры дапамозе органаў ЦКК-НК РСІ, дабілася значных рэзультатаў. Мы ліквідавалі паасобныя ўстановы, якія ў сучасных умовах зусім непатрэбны (акцыяныя і частка мытных устаноў і г. д.). Нам удалося рацыяналізаваць апарат, значна удасканаліць яго формы працы і функцыі. Мы, нарэшце, зчысьцілі частку апарату ад бюракратычных клясавачужых і нягодных нам элемэнтаў. Але-ж гэтыя значныя дасягненьні ўсё-ж такі зьяўляюцца невыстарчальнымі.

Разгорнутае сацыялістычнае наступленьне на ўсім фронце высунула перад дзяржаўным апаратам рад новых адказных задач. Выкананьне гэтых задач, пасьпяховая перамога трудасьцяй, якія стаяць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва — патрабуюць ад нас узмацненьня змаганьня за клясава-выразны і працаздольны апарат, які-б поўнасьцю, усімі сваімі зьвенямі, адказваў запатрабаваньням рэканструкцыйнага пэрыяду.

Вялізарныя задачы ня змогуць быць поўнасьцю выкананы «без сапраўднага паляпшэньня дзяржаўнага апарату, бяз яго спрашчэньня і пазбаўленьня, без рашучае перамогі яго коснасьці, цыганіны, бюракратычнага заціску, кампанейскай круговай парукі, бяз самай рашучай ачысткі апарату ад чыноўнікаў, якія зрошчваюцца з капіталістычнымі і кулацкімі элемэнтамі, якія ня здольны даць адпор спробам кулацка-нэпманскага наступленьня на пралетарыят».

Перад партыяй і рабочай клясай стаяць вялізарнейшыя задачы па выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну ва ўдарным квартале, па разгортваньні калгаснага будаўніцтва і падрыхтоўцы другой бальшавіцкай вясны, па загатоўчых кампаніях, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і сродкаў працоўнага насельніцтва, па забясьпечэньні ўмоў для пасьпяховага выкананьня трэцяга рамачога году пяцігодкі.

Усе звенькі савецкага гаспадарчага і каапэрацыйнага апарату павінны быць прыведзены ў баявую гатоўнасьць, для выкананьня гэтых важнейшых гаспадарча-палітычных заданьняў партыі і ўраду, што забясьпечыць нам посьпехі ў ажыцьцяўленьні пяцігодкі за чатыры гады.

Нашы посьпехі ў сацыялістычным будаўніцтве і ў прыватнасьці ў справе перабудовы і паляпшэньня савецкага апарату былі магчымы толькі дзякуючы творчай актыўнасьці і працоўнаму энтузіязму рабочае клясы і шырока разгорнутай бальшавіцкай самакрытыцы. Нават агенты Пуанкарэ і кулацка - нэпманскіх элемэнтаў унутры нашага Саюзу—Рамзін вымушан быў прызнаць перад пралетарскім судом, што **«растучы энтузіязм рабочае клясы сапраўў усе немёткі «прампартыі» на шкодніцтва».** Актыўнасьць рабочай клясы, яе энтузіязм павінны быць з удвасіраным энэргіяй яшчэ мацней накіраваны на справу ўзмацненьня і паляпшэньня савецкага апарату. «Усякая іншая барацьба з бюракратызмам, якая-б не апіралася на актыўнасьць і самадзейнасьць рабочае клясы, якая-б імкнулася падмяніць кантроль самых рабочых і сялян дзейнасьцю таго, ці іншага апарату, хаця-б самага добрасумленнага, ня можа даць ніякіх сур'ёзных вынікаў», ня можа даць гарантыі за прыведзеньне ў поўную баявую гатоўнасьць нашага савецкага апарату ў змаганьні супроць інтэрвэнтаў, шкоднікаў і бюракратаў,—за наступленьне сацыялістычных элемэнтаў на ўсім фронце. Чыстка савецкага апарату, якая прапавяцца, павінна быць задачай ня толькі органаў ЦКК-НК РСІ, але задачай усёй партыі, усяе рабочае клясы. **Чыстка апарату павінна прайсьці пад знакам праверкі прыстасаванасьці кожнага паасобнага зьвяна нашага апарату да высунутых перад ім задач па выкананьні пяцігодкі, па барацьбе за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, пад знакам рашучай ачысткі яго ад элемэнтаў проста ці ўскосна дзейнічаючых на руку клясаваму ворагу.** Уся работа па паляпшэньні апарату і чысткі яго павінна быць цесна ўвязана з задачамі па ўзмацненьні рацыі і раёнага апарату, памятаючы, што раён зьяўляецца «вузлавым пунктам, дзе ажыцьцяўляюцца дырэктывы партыі і савецкае ўлады».

Партыйныя і прафэсыянальныя ячэйкі ў савецкім апараце павінны стаць актыўнымі дапаможнікамі партыі, органаў ЦКК-НК РСІ у ажыцьцяўленьні дырэктыў XVI партыезду па ўзмацненьні і паляпшэньні апарату. Рацыяналізуючы апарат, робячы яго больш клясавымі, і лабіяючыся таго, каб апарат быў больш танным, партыйныя ячэйкі павінны ўзмацніць сваю пільнасьць да сваячасовага выяўленьня фактаў шкодніцтва і бюракратызму, улічваючы, што паасобныя камуністыя і савецкія працаўнікі «не праяўляюць неабходнай пільнасьці і часам у практычнай рабоце знаходзяцца пад націскам і дзейнічаньнем шкоднікаў» (XV партыезд).

Адной з буйнейшых заваёў у галіне барацьбы з бюракратызмам, за паляпшэньне нашага апарату зьяўляецца новая форма масавага кантролю зьвяна—шэфства прадпрыемстваў над апаратам. **ЗАДАЧЫ НАШЫХ ПАРТЫЙНЫХ І ПРАФЭСЫЯНАЛЬНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ — РАЗГАРНУЦЬ ГЭТУ ФОРМУ РАБОЧАГА КАНТРОЛЮ НАД САВЕЦКІМ, ГАСПАДАРЧЫМ І КААПЭРАЦЫЙНЫМ АПАРАТАМ, ШТО ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДНЫМ З МОЦНЫХ СРОДКАЎ БАРАЦЬБЫ ЗА КЛЯСАВА-БАЯЗДОЛЬНЫ АПАРАТ, ЗА ПЕРАТВАРЭНЬНЕ УСІХ ЗЬВЕНЬНЯЎ САВЕЦКАГА АПАРАТУ Ў САПРАЎДНЫЯ ОРГАНЫ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ.**

У час справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў павінны быць прведены ўсе звенькі нашага дзяржапарату і іх здольнасьць праводзіць у жыцьцё генэральную лінію ленінскай партыі.

Мабілізуючы рабочую клясу супроць спроб шкоднікаў і інтэрвэнтаў, супроць кулацтва і яго агентуры ўнутры нашай партыі — правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, апартуністаў усіх масьцей — скарыстаць наш апарат для іх контр-рэвалюцыйных мэт, ажыцьцяўляючы бальшавіцкімі тэмпамі дырэктывы партыі па паляпшэньні рацыяналізацыі, патаньні апарату, па ўзмацненьні яго кадраў, — мы дабіемся далейшых перамог на шляху ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны саветаў і ажыцьцяўленьня бальшавіцкай пяцігодкі за чатыры гады!

Пляны імпэрыялістаў і іх агентаў Рамзіных, Ларычавых і беларускіх нацыянал-дэмакратаў сарваць пяцігодку—разьбіліся аб энтузіязм і пільнасьць пралетарыяту

Рабочая кляса пад кіраўніцтвам партыі Леніна цьвёрда і ўпэўнена ідзе да перамогі сацыялізму, зьмятаючы са свайго шляху ворагаў сацыялістычнага будаўніцтва

Лавіна гневу і абурэньня

У адказ шкоднікам з „прампартыі" і іх беларускім саюзьнікам—контр-рэвалюцыйным нацдэмам працоўныя БССР мабілізуюць усе свае сілы на змаганьне за сацыялізм!

Абурэньню пралетарыяту і асноўных мас сялянства БССР няма граніц. Кожны дзень рэдакцыяй атрымліваецца з розных нават саміх глухіх куткоў Савецкай Беларусі маса рэзалюцый пратэсту супроць шкодніцкай - контр-рэвалюцыйнэраў з «прампартыі» і беларускіх нацыянал - дэмакратаў. Працоўныя масы ўсюды аднагалосна выяўляюць патрабаваньні **вышэйшай меры пакараньня** для агентаў міжнароднага імпэрыялізму—дапаможнікаў інтэрвэнтаў.

Адначасова працоўныя масы на шкодніцтва і падрыхтоўку інтэрвэнцыі адказваюць масавай кампаніяй па зборы сродкаў у фонд абароны краю і масавай дадатковай падпіскай на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады», узмацненьнем ударніцтва і сацспаборніцтва, замацаваньнем сябе на прадпрыемствах да канца пяцігодкі, выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну ўдарнага кварталу, а батрацка - бяднацкія масы адказваюць на каласьнікі—новай хваляю прыбыў у калгасы, узмацненьнем існуючых калгасаў, а таксама **чырвонымі абозамі бульбы, збожжа, ільну і г. д.**

Так, **агульны сход вучняў і выкладчыкаў Слуцкай вучэрняй школы павышанага тыпу** у адказ на контр-рэвалюцыйныя дзеньні Рамзіных, Ларычавых і беларускіх нацыянал-дэмакратаў абвяшчаюць сябе на 100 проц. членамі Асоавіяхіму, уносяць на пабудову дырыжабля «Клім Варашылаў» 65 руб. і робяць збор сродкаў далей.

Вучні пастанавілі шырэй разгарнуць сацспаборніцтва і ударніцтва і абяцаюць бязьлітосна змагацца з пустаёўкі, прагульшчыкамі, дэзэртырамі з вучобы.

* * *

Рабочыя і служачыя фабрыкі «Чырвоны Харчавік» вітаюць АДПУ—зоркага вартавога гасдрычніцкіх заваёў і патрабуюць ад ураду ўзнагароды ордэнам Леніна.

У адказ на шкодніцтва і падрыхтоўку Пуанкарэ-Вайна, Брыянамі, інтэрвэнцыі супроць СССР, рабочыя будуць біцца за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, за узьняцьце працдысцыпліны, змагацца з прагуламі. Рабочыя дадатковa падпісваюцца на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады». Ужо на агульным сходзе падпісалася 120 чалавек на суму 1.300 руб.

5 рабочых і адзін інжынэр фабрыкі падалі заявы аб уступленьні ў партыю.

* * *

Агульны сход інжынэрна-тахнічных работнікаў пры ўдзеле супрацоўнікаў Беллаперы выказвае сваё глыбокае абурэньне агідна-шкодніцкай работай «прамысловай партыі» і патрабуе бязьлітаснай расправы з яе ўдзельнікамі.

Наш адказ шкоднікам: **увесь калектыў ІТР абвяшчае сябе ўдарным і поўнасьцю аддае сябе ў распараджэньне камуністычнае партыі. Усе сілы, усе веды, усю нашу адданасьць — выкананьню і перавышэньню прамфінпляну, выкананьню пяцігодкі за 3 з паловай гады.**

Мы далучаемся да просьбы вырокіх рабочых мас нашага Савецкага Саюзу аб узнагароде АДПУ ордэнам імя Леніна.

З вінтоўкай у руках гатовы абараняць СССР

Мы цалкам далучаем свой голас да агульнага абурэньня працоўных мас БССР супроць агіднай контр-рэвалюцыйнай работы групы нацыянал-дэмакратычнай інтэлігенцыі і патрабуем ад органаў пралетарскай дыктатуры самага бязьлітаснага пакараньня ворагаў сацыялістычнага будаўніцтва.

БЕЛАРУСКАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ФЛЁТУ сумесна з рабочымі фабрык і заводаў сумесна з усімі працоўнымі СССР, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі сваёй творчасьцю будзе ўзмацняць баяздольнасьць Чырвонай арміі і Савецкай краіны.

Беларускія контр-рэвалюцыянэры—нацыянал-дэмакраты — агенты польскага імпэрыялізму, рыхтавалі рэстаўрацыю капіталізму, дапамагалі інтэрвэнтам ажыцьцявіць сваю задачу — ліквідаваць СССР.

Пісьменьнікі Чырвонай арміі заўсёды гатовы з вінтоўкаю ў руках абараняць бацькаўшчыну сусьветнага пралетарыяту.

БелЛАЧАФ: БЭНДЗ, БАРАШКА, КАЗАК, КАЛЕНТА, ЧАРОТ, ЛЫНЬКОЎ, САМАХВАЛАЎ, ХВЕДАРОВІЧ, ДУНЕЦ, ШАСТАКОЎ, АЛЕКСАНДРОВІЧ, ЛІМАНОЎСКІ, ЗВОНАК, САБАЛЕНКА, ГАЛАВАЧ, КУЧАР, ХАРЫК, ШУШКЕВІЧ, БОБРЫК.

Голас працоўных Магілеўшчыны

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). Магутная хваля пратэсту супроць выкрытай ДПУ Беларусі контр-рэвалюцыйнай арганізацыі беларускіх нацыянал-дэмакратаў шырока пракацілася сярод працоўных Магілеўшчыны.

На праведзеных сходах і мітынгах на прадпрыемствах рабочыя патрабуюць суровага пакараньня агентаў польскага фашызму—**Ластоўскіх, Лёсікаў, Крэскоўскіх і К°.**

Працоўныя Магілеўшчыны адказваюць удвасіраванай энэргіяй у барацьбе за пяцігодку за чатыры гады, 100-процантнай дадатковай падпіскай на пазыку, бальшавіцкім змаганьнем за ленінскую лінію ў нацпаньтыцы.

Рабочыя швэйнай фабрыкі пастанавілі дадаткова падпісацца на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» на 50 проц. месячнага заработку.

На цукеркавай фабрыцы арганізаваны 4 ударныя брыгады, дадатковая падпіска на пазыку дала 2.000 руб.

Весткі аб выкрыцьці контр-рэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў павялічылі падпіску на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады» на Магілеўшчыне **на 10 проц.**

Студэнцтва і настаўніцтва гораду і раёну абяцае яшчэ шчыльней згуртавацца вакол камуністычнае партыі і яе ленінскага ЦК для выкананьня пяцігодкі за чатыры гады і адначасова ўносіць у фонд абароны краіны 214 рублёў.

Расьце дадатковая падпіска на пазыку

Рабочыя, служачыя і спэцыялісты Чырвонаспаводзкага раёну патрабуюць для контр - рэвалюцыянэраў-шкоднікаў усіх масьцей вышэйшай меры пакараньня—**расстрэлу.**

У адказ інтэрвэнтам каморнікі **падалі заявы аб уступленьні ў партыю.** Працоўныя падпісваюцца дадаткова на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады». **На міжсаюзным сходзе дадатковая падпіска дала 1.200 руб.** Акрамя таго, сходам пастаноўлена ўнесьці **аднадзённы заработак у фонд абароны дзяржаўнасьці краіны і 600 руб.—на дырыжабль імя «Праўды».**

* * *

У адказ інтэрвэнтам і іх дапаможнікам Рамзіным, Ларычавым, Лёсікам, Смолічам, Краскоўскім **рабочыя заводу «Дрэвапрацоўшчык» разгарнулі масавую кампанію па дадатковай падпісцы на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады».** У часе мітынгу адразу 22 чалавекі падпісаліся **на 585 руб.** Падпіска працягваецца. Адначасова пастаноўлена ахапіць падпіскай усіх новых рабочых.

* * *

Жанчыны-дэлегаткі гор. Петрыкава ў адказ на падрыхтоўку сусьветнымі драпежнікамі—Пуанкарэ-вайна, Брыянамі, Дэтэрдынгамі ўзбросенага нападу на СССР, уносяць на пабудову дырыжабля «Праўда» **38 р. 28 к.** Далейшы збор сродкаў сярод працоўных жанчын і дэлегацкіх сходаў гэтага раёну праходзіць з вялікім энтузіязмам. Ра-

Пакараць бяз усякай літасьці лёкаяў польскага фашызму—беларускіх контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў

Заслухаўшы даклад аб контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці буржуазна-інтэлігенцкай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў, агульны сход супрацоўнікаў НКЗ БССР, Белсельтрэсту, Белналгасбуду, Трактарацэнтру, ВЭТЭПО з абурэньнем ганьбіць агентаў польскага фашызму і сусьветнай буржуазіі — Лёсікаў, Ластоўскіх, Смолічаў, Некрашэвічаў, Краскоўскіх, Цьвіксвічаў і інш., контр-рэвалюцыйная дзейнасьць якіх была накіравана на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць СССР, зьвяржэньне дыктатуры пралетарыяту і рэстаўрацыю капіталізму ў СССР.

Будучы ідэалёгамі беларускай буржуазіі і кулацтва, гэтыя былыя міністры апэратачнай «БНР» падрыхтоўвалі глебу для інтэрвэнцыі і адчуваньня капіталізму ў БССР. На працягу доўгага часу яны праводзілі **ў культурным і гаспадарчым будаўніцтве БССР контр-рэвалюцыйную лінію на стварэньне ўмоў для рэстаўрацыі капіталізму,** імкнуліся да ўзмацненьня сіл капіталізму ўнутры краіны. Прышчэпаўшчына ў Наркамземе, палітыка Баліцкага ў НКА, ператварэньне Беларускай Акадэміі Навук і НДІ с.-г. у контр-рэвалюцыйны нацыянал-дэмакратычны штаб на барацьбе з лініяй камуністычнай партыі на культурным і ідэалёгічным фронце—уся гэта работа нацыянал-дэмакратаў мела мэтай падрыхтаваць спрыяючыя ўмовы для зьвяржэньня пралетарскай дыктатуры шляхам узброенай інтэрвэнцыі, якая-б магла абапірацца на кулацка-нэпманскія элемэнты ўнутры БССР. Асабліва іскрава контр-рэвалюцыйная дзейнасьць нацыянал - дэмакратаў у галіне сельскай гаспадаркі, дзе палітыкай хутарызацыі нацыянал - дэмакраты ўзмацнялі сваю сацыяльную апору — кулацтва.

Уся дзейнасьць нацыянал - дэмакратаў праходзіла ў цеснай сувязі з беларускімі нацыянал-фашыстамі ў Зах. Беларусі і была падначалена ваенным плянам польскага імпэрыялізму; нацыянал-дэмакраты выконвалі на сутнасьці работу агентаў польскага генштабу.

Агульны сход вітае вернага вартаўніка дыктатуры пралетарыяту—ДПУ Беларусі і патрабуе суровага пакараньня контр-рэвалюцыянэрам. Калектыў НКЗБ, правяўшы яшчэ большую пільнасьць да ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны і ўсе сілы прыкладзе да выкананьня пяцігодкі за чатыры гады, да перабудовы сельскай гаспадаркі на сацыялістычны лад, да разгортваньня калектывізацыі беларускай вёскі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва—гэтае апоры нацыянал-дэмакратаў.

У адказ на контр-рэвалюцыйную дзейнасьць ворагаў дыктатуры пралетарыяту, накіраваную да падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР—калектыў НКЗБ, Белсельтрэсту, Белналгасбуду, Трактарацэнтру і ВЭТЭПО адлічвае адзін процант месячнага заработку ў фонд абароны краіны і пастанаўляе—ўсім супрацоўнікам на 100 проц. уступіць у рады Асоавіяхіму. **Сход выклікае калектывы Наркамфіну БССР, Белкалгасцэнтру, Белмалжывсаюзу, Белільнсаюзу, Белсадагародсаюзу, Белканторы «Сьвінавод», Белсельгасснабу і інш. устаноў і арганізацый НКЗБ** пасьледаваць іх прыкладу.

ПУАНКАРЭ—КАНДЫДАТ У ПРЭМ'ЕРЫ ФРАНЦЫІ

УРАДАВЫ КРЫЗІС У ФРАНЦЫІ

ПАРЫЖ, 6. **Урад Тардзье падаў у адстаўку.** Урадавы крызіс фармальна вынікамі паражэньнем, нанесеным урадам у выпадку, у рэзультаце спрочак на запытаньнях аб агульным напрамку палітыкі ураду.

Выступаючыя з крытыкай палітыкі Тардзье прадстаўнікі «дэмакратычнага і радыкальнага саюзу» настойвалі на неабходнасьці стварэньня такога ўраду і такой урадавай большасьці, у якіх не адчувалася-б «супярэчнасьцяй», што нагадаліся зараз паміж Тардзье і Брыянам.

Большасьцю 147 супроць 139 галасоў сенат прыняў формулу пераходу да чарговых спраў, супроць якой супярэчыў урад, паставіўшы пытаньне аб давер'і.

Алстаўка ўраду прынята прэзыдэнтам Думергам.

* * *

Алстаўка ўраду Тардзье зьяўляецца важным сымптомам, які характарызуе палітычнае і эканамічнае становішча Францыі. Сусьветны крызіс усё больш дае сябе адчуваць і ў Францыі. У дзень адкрыцьця парламенту абанкрутавалі банкі Адам і Устрык. Урад і большасьць парламенту прабавалі растлумачыць банкрутаваньне спэкуляцыйнымі махінацыямі паасобных дэпутатаў. Праўда, пімат міністраў і дзесяткаў дэпутатаў рыцца было ў цуху. Але прычыны крызісу ураду Тардзье ляжаць значна глыбей: яны зьяўляюцца вынікам эканамічнага крызісу і выкліканага ім абвастрэньня супярэчнасьцяй у лягеры імпэрыялістаў. Замежны гандаль Францыі ўпаў; вывад Францыі напіўіўся за першыя 9 месяцаў на 300 тыс. тон параўнальна з мінулым годам. Зьнижаецца загружанасьць вытворчага апарату; марудна, але пэўхіна нарастае беспрацоўе, тухнуць адна за другой доменныя мечы. Французкая буржуазія павялічвае асыгнаваньне на ўзбраеньне, зьмяншае палаткі заможным клясам, павялічвае цяжар падаткаў на працоўных масах. Становішча рабочых пагоршылася. Палітыка Тардзье была пабудавана на пляне падрыхтоўкі да вайны і ўзмацненьні ўціску рабочае клясы. У замежнай палітыцы мы бачылі рэзкае абвастрэньне барацьбы Францыі з Італіяй, пагыбленьне супярэчнасьцяй паміж Францыяй і Нямеччынай.

Абвастрэньне клясавай барацьбы ўнутры Францыі і ўзмацненьне міжнародных супярэчнасьцяй, якія зьяўляюцца вынікам эканамічнага крызісу, выклікала правал Тардзье. Хто прыдзе на зьмену яму, сёньня цяжка сказаць.

Адно можна сказаць, што з прычыны ўзрастаючага крызісу і паглыбленьня супярэчнасьцяй у лягеры сусьветнага імпэрыялізму французкая буржуазія пастараецца пастаіць на чале ўлады ўрад «цьвёрдай рукі» для правядзеньня больш рашучага курсу ўнутры краіны, для зацьвярдзеньня рабочае клясы і для далейшага разгортваньня агрэсыўных плянаў французкага імпэрыялізму ў замежнай палітыцы.

ПУАНКАРЭ ІДЗЕ ДА УЛАДЫ(?)

БЭРЛІН, 6. **«Фосішэ Цэйтунг»** піша, што ў сувязі з урадавым крызісам у Францыі, пакуль цяжка сказаць, хто будзе пераемнікам Тардзье. Аднак, нарэшце, як відаць, надышоў час для ажыцьцяўленьня каліцыі буржуазнага левага крыла і сярэдзінных партый (Тардзье-Машынс) і зусім ня выключана, што Тардзье і сам увойдзе ў яго.

«У якасьці прэм'ера, — піша газэта,— зараз усюды называюць Пуанкарэ, на гледзячы на зробленую ім непасрэдна пасьля правалу ўраду заяву, што стан яго здароўя не дазваляе яму заняць пост прэм'ера».

У адрозьненьне ад усіх іншых нямецкіх газэт, с.-д. **«Форвэртс»** прадугледжвае адзіную прычыну правалу габінэту Тардзье ў «вялікім палітычным і фінансавым скандале з банкам Устрык, пасьля якога ўрад страціў усякі аўтарытэт», «Форвэртс» таксама лічыць, што Пуанкарэ зьяўляецца найбольш поўным кандыдатам у прэм'еры. Із думкі газэты, прэзыдэнт Думерг, як відаць, запрапануе Пуанкарэ склаць новы ўрад і што Пуанкарэ, мусіць, згодзіцца з гэтая прапановай.

Ворагі пралетарскай дыктатуры Ластоўскі, Пічэта, Лёсік, Некрашэвіч, Гарэцкі і Дубах—пазбаўлены годнасьці акадэмікаў

ПАСТАНОВА САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ САВЕЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭСПУБЛІКІ

У сувязі з выяўленай шкоднай, контр-рэвалюцыйнай дзейнасьцю групы акадэмікаў Беларускай Акадэміі Навук, дзейнасьцю, накіраванай супроць дыктатуры пралетарыяту і на зрыў пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе выключыць са складу Беларускай Акадэміі Навук акадэмікаў Ластоўскага Вацлава Юстынавіча, Пічэту Уладзімера Іванавіча, Лёсіка Язэпа Юркавіча, Некрашэвіча Сьцяпана Міхайлавіча, Гарэцкага Гаўрылу Іванавіча і Дубаха Аляксандра Павідавіча, пазбавіўшы іх годнасьці акадэмікаў, як ворагаў пралетарскай дыктатуры.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**
Кіраўнік спраў СНК і Эканамічнай Нарады БССР **М. Калевіч.**

6 сьнежня 1930 г. Мінск.

З ЗАЛІ СУДА

ПЕРАД СУДОМ МАС

Пракурор падсумоўвае вынікі.

Якія сумныя, якія ганебныя вынікі для адных, якія светлыя перспэктывы, якія шырокія кругавіды — для другіх!

Голас пракурора гучыць зьнішчальнай пагардлівасьцю, калі ён гаворыць аб тэрэсах гэтай бясслаўнай старонкі гісторыі контр-рэвалюцыі. Хто яны, гэтыя «лицеден», гэтыя акторы трагікамэдыі, выпляснутыя ўскламучанымі хвалямі на берагавыя каменьні, як абломкі нацярпеўшага крушэньня карабля?

Рамзін — палітычны авантурнік, шпіён, здраднік, дывэрсант, халоп, якога «барыні» выпнаў-бы зараз-жа, як толькі дапас яму даручэньне было-б выкананае.

Чарноўскі — вучоны кіраўнік шкодніцтва, кансультант па шкодніцтве, палітычна выпусташная фігура, стары чорнасотенец, актыўны шпіён і дывэрсант.

Калініньнікаў — стары ворог савецкай улады, заслужаны сабатажнік, які карыстаўся давер'ем савецкай улады, скарбнік шкодніцкай арганізацыі і таксама здраднік і дывэрсант, як і папярэдні два.

Ларычаў — васьледнік Рабіновіча ў шкодніцкім цэнтры, шпіёнка дывэрсыйная і здрадніцкая работа — вось яго заслужны сьпіс.

Фядотаў—тыповая фігура старой расійскай інтэлігенцыі, — стары кадэт, ліберал, шматгадовы супрацоўнік «Русских Ведомостей» і... самы звычайны хабарнік, прадажны за ангельскія фунты і сваю навуку і палітычны і грамадзянскі гонар.

Губы пракурора сьціскаюцца ў пагардлівай усьмешцы, калі ён дае забойчыя характарыстыкі іншых мент дрыжэтных фігур шкодніцкага цэнтру — **Очкіна** («сакратар Рамзіна па партыйнай і савецкай лініі»), Сітніна, «круглы пуль» — вось яго сацыяльная значнасьць. **Купрыянава** — шкодніка-практыка, вернага пса свайго гаспадара Канавалава.

Голас пракурора гучыць упэўненай сілай і магутнасьцю, калі ён гаворыць аб правале ганебных плянаў інтэрвэнцыі, аб перамозе працоўнага энтузіязму мільённых працоўных мас Савецкага Саюзу, аб вялізарных дасягненьнях народаў СССР, аб перамозе пяцігодкі. Усе гэтыя фактары абумовілі ганебны правал падрыўной работы змоўшчыкаў унутры краіны і крах інтэрвэнцыянісцкіх замыслаў. Не дапамагалі і не дапамогуць крыжовыя паходы рымскага папы, абвяржэньні Дэтэрдынга, «громы и молнии» Пуанкарэ, хітрыкі генэральных штабаў Францыі і яе васалаў — Пілсудчы, Рукэвічы, Фінляндыі...

Голас пракурора ўзьнімаецца да гнеўнага патосу, калі ён гаворыць заключныя словы сваёй 8-гадзінай прамовы:

«У той момант, калі мільённыя масы выказваюць гатоўнасьць грудзьмі стаць на абарону СССР, ажыцьцяўляючы галаву за права і магчымасьць будаваць сваю сацыялістычную бацькаўшчыну, так, як яны могуць і хочуць, у той момант, калі масы сусьветнага пралетарыяту глядзяць на СССР, як на шляхаводную зорку ў змаганьні за вызваленьне чалавецтва, у той момант, калі супроць нас падымаюцца і кансалідуюцца сілы аджываючай свой век буржуазіі, калі, прадбачачы сваю пагібель, міжнародная буржуазія канкрэтна ставіць пытаньне аб тэрмінах зьнішчэньня СССР — у гэты момант, калі быць можа прадстаіць аб'ектыўная немінучасьць схваткі двух сьветаў, у гэты момант **ўсё тое, што ў нас у СССР можа дапамагаць і знаёміць садзейнасьць ворожаму нам сьвету, павінна быць змецена і зьнішчана раз назаўсёды.**

Дзяржаўнае абвінавачаньне патрабуе ад суда расстрэлу ўсіх да аднаго абвінавачаных».

І тут у першы раз за гэтыя 12 дзён залю праравала. Пачуўся бурны воплескі. Бранзэ старэйшы звоніць бразуніна, але не маўчыць і заля, вакуль судзьдзі не пакінуцца са сваіх месц.

Падсудныя сядзяць бледныя пад яркімі праменьнямі пражэктараў, але няма куды схавацца ад народнага абурэньня.

Апошнія словы абвінавачаных. Гэта таксама чалавечыя дакументы. Усе, як адзін, схіліўшы галавы перад пралетарскім судом, усе як адзін, заявілі што яны прызнаюць пакараньне, якбы сурова яно ні было, заслужаным пакараньнем. Усе, як адзін, прасілі аб літасьці.

Палітычныя моманты былі ў апошніх словах Рамзіна і Фядотава. Абодва заяўляюць аб поўным крушэньні белай ідэалёгіі, абодва лічаць прац

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

Барацьба за клясава-баяздольны апарат—асноўная задача савецкіх партыйных ячэек

Адмятаючы паклёпы апартуністаў з права-„лявацкага" блёку на органы пралетарскай дыктатуры, выкараняючы бюракратызм, цяганіну і ўсякія скажэньні лініі партыі—мабілізуем масы на паляпшэньне работы савецкага апарату

Павысіць ролю савецкай парт'ячэйкі ў змаганьні за клясава-вытрыманы савецкі апарат

Партыя дабілася ігіганцкіх посьпехаў у рабоце па дастасаваньні дзяржаўнага, савецкага, гаспадарчага і кааперацыйнага апарату да задач рэканструкцыйнага пэрыяду. Чыстка апарату ад сацыяльна - варожых, бюракратычна-чыноўніцкіх элемэнтаў, у якой удзельнічалі шырачэзныя масы рабочых і бядняцка - серадняцкага сялянства, вылучэньне рабочых, змаганьне з бюракратызмам, цяганінай і г. д.—ўсё гэта садзейнічала ўзмацненьню органаў пралетарскай дыктатуры і ўзьнімала работу дзяржаўнага апарату.

Толькі апартуністы — кулацкая агентура ў партыі, фразёры з права-„лявацкага" блёку Сырцова - Ламінадзэ—ня бачаць гэтых вялікіх посьпехаў, якія набыты партыяй у справе паляпшэньня работы дзяржаўнага апарату, у справе яго ўдасканаленьня і ачышчэньня ад бюракратычна - чыноўніцкіх і сацыяльна - варожых элемэнтаў. Ужываючы заіржавелую зброю рэшкі існаваўшых і разьбітых партыяй фракцыйных груп, блёкаўцы з права-„лявацкага" лягеру, тыпу Сырцова і Ламінадзэ, імкнуцца зьвесьці на нішто тую вялізарную работу, якую правяла партыя па паляпшэньні работы дзяржаўнага апарату. Апартуністы з права - „лявацкага" блёку ўзводзяць ні на чым не абгрунтаваныя паклёпы на органы пралетарскай дыктатуры. Партыйныя масы, рабочая кляса і бядняцка - серадняцкае сялянства ведаюць цану гэтым паклёпам, ведаюць, што апартуністы гэтымі паклёпамі адпыхоўваюць настрої кулацтва, якое шалёна супраціўляецца пераможнаму сацыялістычнаму наступленьню.

XVI зьезд партыі падкрэсьліў, што: «Спрашчэньне сыстэмы кіраўніцтва прамысловасьці, крэдыту, падаткаў, гандлёва-кааперацыйных, загатоўчых і замежна - гандлёвых арганізацый — дапамагло групаваньню савецкага апарату ў большую адпаведнасьць з запатрабаваньнямі рэканструкцыйнага пэрыяду і разгорнутага сацыялістычнага наступленьня». Побач з гэтым партыйны зьезд вынуў рад канкрэтных, вялікай парт'ячнай важнасьці задач, якія на месцах у практычнай рабоце павінны быць праведзены ў жыцьцё партыйнымі арганізацыямі.

Гэтыя задачы патрабуюць ад партыйных ячэек савецкіх устаноў напружанай работы па далейшым удасканаленьні работы дзяржаўнага апарату. Савецкія парт'ячэйкі павінны ўзмоцніць сваю работу па кіраўніцтве работай устаноў, якія імі абслугоўваюцца, павінны сыстэматычна займацца пытаньнямі савецкага будаўніцтва. На сёньняшні дзень мы маем рад выпадкаў, калі некаторыя савецкія парт'ячэйкі недастаткова працавалі над выкананьнем сваіх першарадных задач. Тут мы хочам паказаць і на тое, што некаторыя райкомы партыі не аддаюць належнай увагі разгортваньню работы савецкіх парт'ячэек. Характэрны факт. Ні адзін з раённых камітэтаў партыі (тых, якія працуюць ў былых акруговых цэнтрах) за пэрыяд, які прайшоў пасьля ліквідацыі акруг, не займаўся пытаньнем работы парт'ячэек савецкіх устаноў, між тым, як рад парт'ячэек слаба працуе і змагаецца за выразнасьць у рабоце савецкага апарату.

Партыйная ячэйка кожнай савецкай установы павінна павысіць сваю ролю ў змаганьні за танны, гібкі і працаздольны савецкі апарат, дабіваючыся ад кожнай установы такой работы, якая-б поўнасьцю забясьпечвала праведзеньне генэральнай лініі партыі, партыйныя ячэйкі павінны актыўнасьць шырокіх працоўных мас накіраваць на справу ўдасканаленьня работы гэтых устаноў. Ячэйкі павінны вывучаць і сачыць за тым, як перабудавалі сваю работу ўстановы ў сувязі з пераходам на раённую сыстэму, як забясьпечылі кіраўніцтва раённым апаратам.

Зараз праводзіцца агляд работы вылучэнцаў. Ён павінен прыкаваць да сябе ўвагу ўсіх партыйных ячэек, бо парт'ячэйкі і прафарганізацыі нясуць адказнасьць за стварэньне спрыяючых умоў для работы вылучэнцаў.

Партыя на працягу ўсяго часу вядзе змаганьне за зьніжэньне выдаткаў на кіраваньне, таму партыйныя ячэйкам трэба ўважліва сачыць за тым, як абслугоўваныя імі ўстановы зьніжаюць адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі і гэтым самым дабіваюцца патаненьня кошту ўтрыманьня апарату.

У некаторых установах яшчэ наглядаюцца праявы бюракратызму і цяганіны, пануе парапелізм у рабоце. Побач з тым, што «кожны камуніст абавязаны быць ударнікам у змаганьні з бюракратызмам», трэба мабілізаваць самыя шырокія масы на змаганьне з ўсякімі бюракратычнымі праявамі і скажэньнямі лініі партыі ў рабоце савецкіх, гаспадарчых і іншых органаў. Ня трэба забываць ні на адну хвіліну, што змаганьне з бюракратызмам ёсьць адзін з важнейшых вучасткаў клясавага змаганьня. Чыноўніцка-бюракратычныя элемэнты супраціўляюцца праведзеньню кожнага мерапрыемства партыі, сустракаюць у штыкі кожнае новае пачынаньне. Гэтым супраціўленьням трэба даць бязьлітасны адпор.

Асноўная задача кожнай савецкай ячэйкі — гэта змаганьне за клясава - вытрыманы, працаздольны і гнуткі апарат, за апарат, які ў сваёй рабоце забясьпечвае выразнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, які служыць справе сацыялістычнага будаўніцтва. Наносячы бязьлітасны ўдар па апартуністах усіх кораў, па агентах варожае клясы, па права-„лявацкім" блёку, здмятаючы іх беспадстаўныя апартуністычныя паклёпы на органы пралетарскай дыктатуры, партыйныя ячэйкі павінны ўзмацніць сваю практычную работу, па спрашчэньні дзяржаўнага апарату, па кіраўніцтве яго штодзённай работай.

У палоне бязьдзейнасьці

Дубровенская гарсавецкая ячэйка КП(б)Б не ўсьвядоміла задач і палітычнай адказнасьці за сваю работу ў пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце на капіталістычныя элемэнты, якое праходзіць ва ўмовах шалёнага супраціўленьня клясавага ворага. Ячэйка не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасьці з задачамі рэканструкцыйнага пэрыяду, не мабілізавала асноўных працоўных мас на выкананьне галоўнейшых гаспадарча - палітычных задач партыі і бязьлітасную барацьбу з кулацкімі элемэнтамі.

Ячэйка зусім ня цікавілася работай установы, якія ёю абслугоўваюцца. Работа гарсавету праходзіла без належнага кіраўніцтва з боку ячэйкі. Галоўнейшыя пытаньні гаспадарчага і культурнага будаўніцтва не абмяркоўваліся на пасяджэньнях бюро і сходах ячэйкі. За апошнія месяцы зусім не праводзіліся пасяджэньні бюро ячэйкі. Пляны работы складаліся для фармальнасьці, яны, фактычна, ня выконваліся.

Характэрна, што на гэтую бязьдзейнасьць кіраўніцтва не рэагавалі члены ячэйкі, ня ставілі своячасова пытаньня аб зьмене бюро ячэйкі, як нядольнага забясьпечыць перабудову работы, перавесьці яе на бальшавіцкія тэмпы.

Апартуністычная стаўка на самацёк у выкананьні галоўнейшых задач партыі, непаваротлівасьць, закасьцянелась — характэрныя рысы ў рабоце кіраўніцтва гарсавецкай ячэйкі.

Паводле пастановы Дубровенскага РК КП(б)Б зараз зьменена кіраўніцтва ячэйкі. Усяму складу бюро ячэйкі абвешчана вымова. Сакратару ячэйкі — Вітманду—суровая вымова.

Гэтыя арганізацыйныя мерапрыемствы павінны ўнесьці карэнны пералом у рабоце гарсавецкай парт'ячэйкі.

І.

Рад маладых спэцыялістаў ухіляюцца ад работы ў раёне

Нядаўна адбыўся выпуск студэнтаў, якія скончылі факультэт наркамасу БДУ. Выпушчана 45 таварышоў, а з іх толькі 15 чалавек едуць для работы ў раёны. Іншыя прыстройваюцца або імкнуцца прыстроіцца ў Менску. Характэрна паказаць на тое, што ў ажыцьцяўленьня гэтага імкненьня раду таварышоў, скончыўшых БДУ, садзейнічаюць асобныя цэнтральныя ўстановы. Дзяржплян накіраваў на раёны таварышоў, якія скончылі плянава-статыстычнае аддзяленьне БДУ, а Наркампрацы пакідае іх на рабоце ў сваім апараце (пакінуты Асятроў, Хмялоўскі і інш.).

Разам з гэтым мы хочам паказаць і на такое недапушчальнае становішча, калі рад скончыўшых таварышоў ухіляюцца ад работы ў раёне. Напрыклад, т. Левановіч застаецца ў Інстытуце Прамысловасьці ў якасьці экзамінуючага плянавіка, Нісэльсон, які скончыў фінансавае аддзяленьне, быў накіраваны ў раён, але чамусьці таксама застаўся ў Менску. А тав. Галер яшчэ да разьмеркаваньня прыстроіўся на адным з заводаў, каб таксама ня ехаць у раён. Ухіляюцца ад паездкі ў раён, стараюцца прыстроіцца ў горадзе і т. т. Корбут, Шыф, Грай, Капоска, Кенлік, Валодзька, Гурвіч, Мароз, Пячонка, Міронава і інш. Яны шукаюць усякіх прычын і абставін толькі-б не працаваць у раёне.

ЦКК—НК РСІ павінна зацікавіцца гэтай справай і прыцягнуць да адказнасьці тых, хто зрывае справу ўмацаваньня раёнаў кадрамі спэцыялістаў.

Студэнты (3 подпісы).

Аб арганізацыі гаркому КП(б)Б у Менску

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. Канстатаваць, што пры існаваньні двух райкомаў партыі ў гор. Менску пасьля ліквідацыі акруг райкомы партыі гор. Менску ня мелі магчымасьці ажыцьцявіць поўнае і сыстэматычнае кіраўніцтва гаспадарчым, камунальным і культурным будаўніцтвам гор. Менску і стваралі паралелізм у кіраўніцтве важнейшымі агульна-гарадзкімі арганізацыямі: гарсаветам, ЦРК і г. д.

2. У мэтах забесьпячэньня лепшага партыйнага кіраўніцтва:

а) мабілізацыяй мас вакол пытаньняў разгорнутага наступленьня па ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва;

б) гаспадарчым, камунальным, культурным будаўніцтвам, каапэрацыяй, большым прыцягненьнем гарадзкой партыйнай арганізацыі да гэтага будаўніцтва — зьліць Фрунзаўскі і Кастрычніцкі райкомы партыі і АРГАНІЗАВАЦЬ ГАРАДЗКІ КАМІТЭТ ПАРТЫІ ГОР. МЕНСКУ.

3. Для правядзеньня ўсёй работы па ліквідацыі раённых арганізацый і стварэньня гаркому выпучыць аргбюро ЦК КП(б)Б у складзе наступных т.т.: ШАРАНГОВІЧА, КАВАЛЬЧУКА, АКСЮЧЫЦА, ШПЭКТАРАВА, ПЯТУШКОВА, ЖУКОВІЧА, БАЧАРОВА, ШУЛЬКІНА, БІГЕ, ДЗЯЦІНА, РЫСКІНА, ГУТКІНА.

Сакратаром аргбюро зацьвердзіць тав. КАВАЛЬЧУКА.

4. Склікаць гарадзкую партыйную канфэрэнцыю на 25 сьнежня.

Даручыць аргбюро прадставіць да наступнага пасяджэньня сакратарыяту модус прадстаўніцтва і ўсе практычныя мерапрыемствы па скліканьні гарадзкой канфэрэнцыі.

Да скліканьня канфэрэнцыі і стварэньня гаркому папярэдзіць райкомы аб недапушчальнасьці аслабленьня тэмпу работы райкомаў, рашуча змагаючыся з усякімі дэмабілізацыйнымі настроямі.

Аб становішчы работы сярод беднаты і далейшых задачах

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. У сувязі з дасягнутымі посьпехамі партыі ў справе калектывізацыі сельскай гаспадаркі, сацыяльная база савецкай улады ў вёсцы ўмацавалася і пашырылася. Шырокае разгортваньне калгаснага руху стварыла новую апору савецкай улады ў вёсцы ў асобе калгасьніка.

Гэта, аднак, ні у якім выпадку не азначае адмаўленьня партыі ад работы з васковай беднатой, асабліва на дасягнутым у БССР узроўні калектывізацыі, калі пераважная большасьць сялянскіх гаспадарак усё яшчэ застаецца адзіноасобнымі гаспадаркамі. Гутаркі аб адмаўленьні партыі ад работы з беднатой і ад апоры на беднату — ёсьць гутаркі яўна-апартуністычныя і патрабуюць рашучага асуджэньня. Недаацэнка і пасьлядоўнасьць у рабоце па арганізацыі беднаты і батрацтва зьяўляецца адной з самых горшых праяў правага ўхілу на практыцы.

2. ЦК КП(б)Б адзначае, што, ня гледзячы на рад дырэктыў кіруючых органаў партыі аб разгортваньні работы з батрацтвам і беднатой, фактычнае становішча работы ў раёнах сьведчыць аб невыкананьні нізавымі партыйнымі арганізацыямі і радам цэнтральных устаноў дырэктыў партыі аб разгортваньні работы з батрацтвам і беднатой:

а) Важнейшыя гаспадарча - палітычныя кампаніі ў вёсцы (сяўба, заагатоўкі) праходзяць без выстарчальнага разгортваньня з боку партыйных арганізацый работы сярод батрацтва і беднаты. Прычынай недахопаў у правядзеньні кампаніі ў значнай меры зьяўляецца слабасьць работы з беднатой.

б) Ня гледзячы на простыя паказаньні ЦК, групы беднаты не арганізаваны пры адпаведных калгасах і ўсіх сельгаспадарчых таварыствах, а там, дзе групы арганізацыйна афармлены, не разгарнулі належнай практычнай дзейнасьці.

в) Якасны падбор кіраўнікоў груп беднаты ў асноўнай масе поздавальняючы, акрамя таго, райкомы КП(б)Б не забясьпечылі выстарчальнага кіраўніцтва імі.

г) Масцца яўнае аслабленьне ў радзе месц матар'яльнай і культурнай дапамогі беднаце. Фонды, асыгнаваныя для каапэраваньня батрацтва і беднаты, у большасьці каапэрацыйных арганізацый выкарыстоўваюцца зусім недавальняюча.

3. Становішча, што стварылася ў рабоце з батрацтвам і беднатой, зьяўляецца недапушчальным і патрабуе карэннага рашучага пералому. Работа сярод беднаты і батрацтва павінна быць рашуча алешпана як унутры калгасаў, так і ў адзіноасобным сэктары сельскай гаспаркі.

Пры разгортваньні работы сярод беднаты партыйныя арганізацыі павінны выходзіць з таго, што:

а) Беднота зьяўляецца тэй сілай, абапіраючыся на якую і арганізуючы яе, партыйныя арганізацыі павінны весьці рашучую барацьбу супроць спроб кулацтва ўнесьці разлад паміж адзіноасобнікамі і калгасьнікамі, супроць спроб кулацтва ўзяць над сваё кіраўніцтва адзіноасобніка.

б) «Партыйныя арганізацыі ў калгасах павінны забясьпечыць такую пастаноўку работы груп беднаты, каб яны ня толькі абаранялі непасрэдныя інтарэсы беднаты, але і салдзейнічалі ўмацаваньню саюзу рабочае клясы і васковай беднаты з сераднякамі» (з пастановы XVI зьезду УсеКП(б).

Унутры калгасу работу з беднатой неабходна накіраваць на ўсямернае гаспадарчае і арганізацыйнае замацаваньне калгасаў. Беднота павінна зьяўляцца застрэльшчыкам сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва ў калгасе, даваць узоры найбольш тэрміновай і самаадданай працы, садзейнічаць максымальнаму ўзьняцьцю ў калгасе прадукцыйнасьці і якасьці працы.

4. У мэтах максымальнага ўмацаваньня работы сярод беднаты, ЦК КП(б)Б прапануе райкомам:

а) Арганізаваць групы беднаты пры ўсіх сельска - гаспадарчых таварыствах, каапэрацыйных і савецкіх арганізацыях. Ва ўсіх калгасах павінна быць пастаўлена работа з беднатой. Аднак, не ва ўсіх калгасах неабходна стварэць групы беднаты. У тых калгасах, дзе пасьпяхова выжываюцца спажывецкія настрої, існуюць сьвядомыя адносіны да выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай, гаспадарчае ўмацаваньне калгасу шляхам інтэнсыфікацыі і пашырэньня гаспаркі, правільная лінія ў пытаньнях абагульненьня, паяўнасьць працоўнай дысцыпліны і правільная арганізацыя працы—ствараюць упэўненасьць у сапраўднай моцнасьці данага калгасу,—групы беднаты не павінны стварацца. Наадварот, групы беднаты павінны ствараца па пастанове РК КП(б)Б ва ўсіх тых выпадках, дзе паяўнасьць церпяй у асяродзішчы калгасьнікаў, арганізацыйныя недахопы, індывідуалістычныя або спажывецкія імкненьні ствараюць умовы, пры якіх пасьпяховае разьвіцьцё калгасу ўскладняецца.

Што датычыць калгасаў, якія панова арганізуюцца, дык у першы пэрыяд іх існаваньня неабходна арганізоўваць групы беднаты з ліку батракоў і беднякоў, абраных у члены праўленьня і рэв. камісіі калгасу.

Асноўнай умовай пры правядзеньні работы з беднатой у калгасах павінна зьявіцца ня толькі недапушчэньне—якіх бы там ні было разладаў паміж калгасьнікамі, беднякамі і сераднякамі, а наадварот — устанаўленьне шчыльнага саюзу з серадняком, накіраванага на ўзмацненьне калгасу і абавязковае прыцягненьне серадняка да кіраўніцтва гаспадарчым жыцьцём калгасу.

б) Дзейнасьць груп беднаты ў калгасах неабходна падпарадкаваць таму, каб калгасы найбольш пасьпяхова спраўлялісь з гаспадарча-палітычнымі задачамі, што на іх ускладаюцца. Стрыжнявымі пытаньнямі работы груп беднаты павінны зьявіцца вытворчыя пытаньні жыцьця калгасу. Асеньняя сяўба, правільная арганізацыя працы, разьмеркаваньне ўраджаю, вырашэньне задач жывёлагадоўлі, своячасовае выкананьне пляну збожжазагатовак, выкананьне кантрактацыйных дагавораў, барацьба з спажывецкімі настроямі, з бестаспадарчасьцю ў калгасе—вакол гэтых важнейшых пытаньняў і неабходна будаваць работу груп беднаты ў калгасах. Група беднаты павінна зьяўляцца асноўным дапаможнікам праўленьня і парт'ячэйкі ў вырашэньні гэтых задач.

в) У далейшай дзейнасьці райкомаў увесьці ў сыстэму скліканьне нарад кіраўнікоў груп беднаты, паладзіўшы сыстэматычнае кіраўніцтва і інструктаж кіраўнікоў груп беднаты, а таксама рэгулярную справаздачнасьць кіраўнікоў нарад парт'ячэйкамі.

г) Пры правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній неабходна арганізоўваць работу так, каб максымальна актывізаваць удзел батрацтва і беднаты ў гэтых кампаніях. Паняраэлныя нарады, сходы і канфэрэнцыі беднаты з канкрэтным абгаварэньнем пытаньняў практычнага ўдзелу беднаты ў правядзеньні кампаній, — зьяўляюцца элемэнтарнай формай работы і павінны шырока практыкавацца партыйнымі арганізацыямі.

д) У працягу месячнага тэрміну праверыць выдаткаваньне фондаў беднаты і батрацтва, што вылучаны па лініі каапэрацыі, КСУ і інш. арганізацый, прыняўшы сапраўдныя меры да поўнага скарыстаньня фондаў па прызначэньні.

ьнікам праверкі далажыць ЦК.

е) Прыняць рашучыя меры па пр пягненьні ў работу батрацка-бядняц груп і ва ўсю работу сярод бедн жанчын-батрачак і бядняцкіх.

Устанавіць пэрсанальную адказна кіраўнікоў груп беднаты за прыцягне не да работы батрацка-бядняцкіх батрачак і бядняцкіх.

5. У сувязі з тым, што найбольш ба паставлена работа груп беднат калгасах і сельска-гаспадарчых тавар тах, ЦК КП(б)Б прапануе на пра бліжэйшага часу правесьці праве агляд работы груп беднаты і работы род беднаты наогул у гэтых арга цыях. Праверку правесьці з мэтай сымальнага ўзмацненьня работы с бенаты ў калгасах і с. г. таварыст ўстанаўленьня сапраўднага кіраўні з боку кожнай партыйнай ячэйкі г работай.

Агіт. масаваму аддзелу ЦК КП(б) распрацаваць дырэктыўныя паказан аб правядзеньні агляду-праверкі, заб печыць прыцягненьне да ўдзелу ў п верцы ўсёй калгасна-каапэрацыйнай стэмы, распрацаваць тэрміны і арган раць шырокае асьвятленьне гэтага таньня ў цэнтральным і раённым ку. Намечаныя мерапрыемствы ўн на зацьверджаньне чарговага сакрат яту ЦК.

6. Фракцыям цэнтральных і раё савецкіх і каапэрацыйных устаноў верыць становішча работы сярод б ты па ўсёй сыстэме і дабіцца ўзмац ні гэтай работы. У сувязі з тым, дырэктыва Бюро ЦК аб вылучэньні ньняльных інструктароў па рабоце с беднаты пры ЦКВ, Калгасцэн Паляводсаюзе, Белмалкізвёлсаюзе і жывецкай каапэрацыі гэтымі ганізацыямі поўнасьцю ня вык на ў другі раз, прапанаваць п чыць спэцыяльных таварышоў, ас най нагрузкай якіх павінна зьявіц бота сярод беднаты. З ліку аказа працаўнікоў раённых устаноў паказа арганізацый вылучыць спэцыяльны варышоў, на якіх усклaсьці правя не работы сярод беднаты.

Агіт. масаваму аддзелу ЦК прасав за выкананьнем гэтай пастановы.

7. ЦК КП(б)Б адзначае, што асн слаба пастаўлена работа сярод бед ў сыстэме саматужна - прамысловых арцеляў каапэрацыі. Групы беднаты ў больш саматужна - прамысловых арцеляў арганізаваны. Прапанаваць фракцы сампрамсаюзу разгарнуць работу ў беднаты, мабілізаваўшы яе ўвагу н гортваньне сацспаборніцтва ў сампрамкаапэрацыі, на ачыстку ар ад кулацка-нэпманскіх элемэнтаў.

Пры правядзеньні работы сярод б ты райкомы павінны больш увагі ваць пастаноўцы гэтай работы ў каапэрацыі.

8. ЦК КП(б)Б адзначае аўпа вальняючы ўдзел камсамольскай ар актыўнасьці ў рабоце партыі сярод бе Прапанаваць ЦК ЛКСМБ прыняць да павышэньня актыўнага ўдзел самолу ў рабоце сярод беднаты, а на лініі разгортваньня работы ся рацка-бядняцкай моладзі.

9. Арг. інструктарскаму аддзелу разам з агітмасавым аддзелам, ваць работу сярод беднаты двух ных парт. арганізацый, пасьля слухаць даклады райкомаў на б рыяце ЦК.

10. Лічыць неабходным скліка ЦК КП(б)Б нараду па пытаньн ты сярод батрацтва і беднаты. Д аргінструк. і агіт. масаваму адд падрыхтоўчую работу да нарады ніць тэрмін і склад удзельніка ды, унёсшы на зацьверджаньне та Сакратарыяту ЦК.

Перавыбарчая кампанія і „савецкая эстафэта"

П. ШАСТА

Перавыбары саветаў—найважнейшая палітычная кампанія. Сёлетняя справаздачна перавыбарчая кампанія праходзіць у надзвычай складаных умовах.

Другі год пяцігодкі даў вялізарнейшыя дасягненьні як у галіне індустрыялізацыі нашай прамысловасьці, так і ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі.

Цэлы рад волатаў-прадпрыемстваў уступіў у сталёвы строй барацьбітоў за шпаркія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне. Гушчары асінаўскіх лясоў, непраходныя багны балот ажывіліся стукатам турбін першай беларускай раённай электрастанцыі, якая, чэрпаючы энэргію ў чорным золаце балот закруціла шківы на прадпрыемствах Віцебску, Воршы, Магілева, Дубровны, запаліла лямпачку Ільліча ў вакольных бядняцка-серадняцкіх хатах... Пушчана магілеўская фабрыка штучнага шоўку. Поўным ходам пачынае ісьці Гомсельмаш. Кантрольныя лічбы, вызначаныя Кастрычніцкім пленумам ЦК КП(б)Б для калектывізацыі сельскае гаспадаркі—дасягнуць ня менш 20 проц. на 1 сьнежня—выконваюцца.

Гэтыя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў другім годзе пяцігодкі мы маем, дзякуючы няўхільнаму, цьвёрдаму, настойлівому праведзеньню ў жыцьцё генэральнай лініі камуністычнай партыі і яе ленінскага Цэнтральнага Камітэту. Гэтыя посьпехі ярка пацьвердзілі правільнасьць генэральнай лініі партыі і ўшчэнт разьбілі звышіндустрыяльныя, антысерадняцкія ўстаноўкі «левых», кулацкія «тэорыі» і «тэорыйкі» правых, пляцформы і пляцформачкі беспрынцыпнага антыпартыйнага права-„лявацкага" блёку Сырцова-Ламінадзэ. Гэта—лёс антыпартыйных плыняй, гэта—лёс апартуністычных ухілаў у партыі, прабуючых атакаваць генэральную лінію ленінскай партыі ў сацыялістычным будаўніцтве.

Але было-б вялікай памылкай, калі-б мы, гаворачы аб нашых посьпехах і дасягненьнях, заплюшчвалі вочы на тыя труднасьці, на тыя недахопы і прарывы, якія ёсьць на шляху сацыялістычнага будаўніцтва. Гаварыць пра дасягненьні і маўчаць пра труднасьці, значыць, дэмабілізаваць масы, якія будуюць сацыялізм, расхалоджваць іх энтузіязм, зьніжаць тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва.

Аб тым, што плян другога году пяцігодкі намі выкапан толькі на 96 проц., што сабекошт прадукцыі зьніжан толькі на 8 проц. замест 11 проц., што мы маем невыкананьне паказальнікаў на ўздыме прадукцыйнасьці працы, аб тым, што на гэтых вучастках змаганьня за прамфінплян, трэба сканцэнтраваць асаблівую ўвагу—павінен ведаць кожны рабочы.

«Не закідаеш шапкай» і тых труднасьцяй, якія ляжаць на шляху сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспаркі. Сацыялістычнае будаўніцтва ў нашай краіне праходзіць ва ўмовах разгорнутага па ўсім фронце рашучага наступленьня на капіталістычныя элемэнты ў горадзе і на вёсцы. Кожны пераможны крок сацыялістычнага будаўніцтва сустракае шалёнае супраціўленьне клясавага ворага—кулака па вёсцы, непмана—у горадзе. Ва ўмовах абвостранага клясавага змаганьня змагаемся мы за выкананьне задач сацыялістычнага будаўніцтва, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

«Ясна, што мы ўжо ўступілі ў пэрыяд сацыялізму, бо сацыялістычны сэктар трымае цяпер у руках усе гаспадарчыя вагары ўсяе народнае гаспадаркі, хаця да пабудовы сацыялістычнага грамадзтва ў зьнішчэньня клясавых адрозьненьняў яшчэ далёка»... (Сталін).

Мы шчыльна падышлі да вырашэньня праблемы стварэньня бясклясавага грамадзтва, канкрэтна распачалі ліквідацыю кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі і з усёй рашучасьцю «абмяжоўваем і выціскаем» кулака ў раёнах нясуцэльнай калектывізацыі.

Тыя мэтады клясавага змаганьня, якімі карыстаўся кулак раней, перастаюць яго здавальнаць. Ён шукае зараз больш «изысканных», больш «тонкіх» сродкаў змаганьня, чым абрэз або адкрыты тэрор. Ён хаваецца часам пад маскай савецкага актывіста, ён хаваецца пад нацыянальнай вопраткай, ён выпускае замест сябе з'агітаванага або споенага малаасьвядомага бедняка і карыстаецца адсталасьцю жанчыны. Ён знаходзіць сваіх абаронцаў у асобе буржуазных спэцаў Кандрацьцевых, Громакаў, у асобе вялікадзяржаўных шавіністаў, беларускіх контр-рэвалюцыянэраў—нацыянал-дэмакратаў. Ён мае сваю агентуру сярод найбольш няўстойлівай часткі нашай партыі—апартуністаў усіх масьцей. Фронт клясавага ворага ў нашай краіне праз вялікадзяржаўных шавіністаў, нацыянал-дэмакратаў, праз контр-рэвалюцыянэраў з «прамысловай партыі»—Рамзіных, Ларычавых і К° змыкаецца з агульным імпэрыялістычным антысавецкім фронтам капіталістычных дзяржаў. Бярэцца стаўка на інтэрвэнцыю, вызначаюцца тэрміны, пляны і выкапаўцы ўзброенага нападу на СССР і г. д.

Вось тыя ўмовы, у якіх павінна праходзіць найважнейшая палітычная кампанія перавыбараў саветаў. Гаварыць у такіх умовах аб тым, што пытаньне «хто каго?» зьнімаецца з парадку дня, значыць граць на руку клясаваму ворагу, значыць скакаць пад дудку кулака, сьпяваць ва унісон з правымі апартуністымі «арыю» пра «мірнае ўрастаньне кулака ў сацыялізм».

Пераможнае змаганьне за працаздольны і клясава-вытрыманы склад сельсавету, змаганьне за моцны нізавы савецкі апарат, прыстасаваны да выкананьня найважнейшых палітычных, гаспадарчых і культурных задач сацыялістычнага будаўніцтва,—вось асноўны лёзунг, пад якім павінна праходзіць падрыхтоўка да перавыбараў у саветы і сама справаздачна-перавыбарчая кампанія.

Прадпасылкай да пасьпяховага ажыцьцяўленьня гэтага лёзунгу зьяўляецца ў канчатковым выніку пераможнае змаганьне за масы, якое павінна даць самы шырокі ўдзел выбаршчыкаў у справаздачна-перавыбарчых сходах, максымальную арганізаванасьць і актыўнасьць рабочых, калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас у часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Трэба адкрыта сказаць, што рад нашых сельсаветаў працуюць без належнай і пастаяннай апоры на масы ў асобе рабочых і калгасных мас, у асобе бядняцкіх груп. Апошняя кампанія, якія зараз праводзяцца на вёсцы—заагатоўкі, арганізацыя новага прыліву ў калгасы—з асаблівай выразнасьцю падкрэсьлілі адарванасьць некаторых паасобных зьвеньняў нізавога савецкага апарату ад мас і масавай работы. Што можна сказаць пра такія сельсаветы і іх работу? Зусім ясна, што работа сельсавету, які працуе «ў адзіночку», які не арганізуецца на шырокія кадры актывістаў-беднякоў, батракоў і калгасьнікаў, не дасягае мэты. Такі сельсавет ня здольны кіраваць вялізарнейшай сацыялістычнай будоўляй на вёсцы, асабліва калі ўлічваць, што ў сувязі з ліквідацыяй акруг пашырыліся правы і функцыі, ускладніліся абавязкі нізавога савецкага апарату.

І яшчэ адну акалічнасьць трэба мець на ўвазе, калі гутарка ідзе пра змаганьне за працаздольны і клясава-вытрыманы сельсавет. Мінулыя перавыбары саветаў праходзілі раньняй вясной 1929 г., калі пры правядзеньні калектывізацыі на мясцох быў дапушчан перагібаў. Гэтыя перагібы, якія своячасова былі выпраўлены партыяй, гралі на руку клясаваму ворагу і спрыялі таму, што ў некаторыя сельсаветы пралез элемэнт, варожы калектывізацыі сельскае гаспаркі, элемэнт, варожы задачам сацыялістычнага будаўніцтва.

Змаганьне за масы ў часе справаздачна-перавыбарчай кампаніі, бязумоўна, спаткае на сваім шляху і арганізаваную падрыхтоўку да перавыбараў з боку клясавага ворага.

З месц паступаюць весткі аб тым, што кулак арганізуе свой актыў для ўдзелу ў справаздачна-перавыбарчых сходах, складае сьпісы сваіх кандыдатаў у сельсавет.

Гэта лішні раз падкрэсьлівае неабходнасьць сур'ёзьнейшай падрыхтоўкі да перавыбараў, арганізацыі і падрыхтоўкі да справаздачна-перавыбарчых сходаў савецкага актыву, мабілізацыі калгасных, батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх мас на актыўны ўдзел у перавыбарах.

Але-ж мала выкінуць лёзунг. Трэба паказаць канкрэтныя шляхі для яго ажыцьцяўленьня, трэба даць мэтад змаганьня за масы, мэтад жыцьцёвы і прытым разьлічаны на кароткі адрэзак часу, які застаўся да справаздачна-перавыбарчых сходаў. **Такім мэтадам рэдакцыя «Савецкай Беларусі» разам з партыйным актывам Каралінскага раёну выбрала «савецкую эстафэту». На гэты мэтад «Зьвязда» лічыць патрэбным зьвярнуць увагу партарганізацый і нашага друку.**

***

У чым сутнасьць «савецкай эстафэты»?

Яна ў асноўным зводзіцца да арганізацыі і падрыхтоўкі савецкага актыву ў кожным населеным пункце, да актыўнага ўдзелу ў справаздачна-перавыбарчых сходах, яна павінна забясьпечыць максымальны процант выбаршчыкаў на сходзе, максымальную актыўнасьць калгасных, батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх мас, разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі.

Асноўнае, на чым згуртоўваецца савецкі актыў, гэта праверка работы сельсавету па наступных пяці «маршрутах»: сельсаветы і калгаснае будаўніцтва; сельсаветы і загатоўкі, мабілізацыя сродкаў насельніцтва; сельсаветы і культурнае будаўніцтва і сельсаветы ў веснавой і асеньняй кампаніях.

Якіх мэт павінна дасягнуць эстафэта, п находячы па гэтых маршрутах?

Мабілізаваць увесь савецкі актыў на праверку і перабудову работы нізавога савецкага апарату і кожнага ў паасобку дэпутата.

Выявіць, па каго апіраўся сельсавет у сваёй рабоце (масавая работа, работа з беднатой і калгасьнікамі, работа сэкцый сельсавету).

Выявіць працаздольнасьць і клясавую вытрыманасьць сельсавету і паасобных дэпутатаў пры ажыцьцяўленьні задач партыі і ўраду.

Высьветліць, ці выканаў сельсавет паказ сваіх выбаршчыкаў.

Выявіць лепшых і горшых дэпутатаў сельсавету.

Вось як вызначаюцца асноўныя мэты «савецкай эстафэты» ў самой эстафэце.

Але-ж і гэтым не вымяраюцца канкрэтныя вынікі савецкай эстафэты.

На шляху свайго сьледваньня, у кожным населеным пункце, яна павінна пакінуць:

— Моцна згуртаваны, добра інструктаваны і падрыхтаваны да справаздачна-перавыбарчых сходаў савецкі актыў.

— Актыўных удзельнікаў (судакладчыкаў) для справаздачна-перавыбарчых сходаў.

— Буксірныя брыгады з калгасьнікаў, беднаты і сераднякоў для падцягваньня адстаючых галін работы сельсавету.

— Групу салдзейнасьці перавыбарам савету, абавязак якое—дапамагаць выбарчай камісіі ў яе рабоце (апавяшчэньне выбаршчыкаў, падрыхтоўка памяшканьня для сходу, выпуск насьценнай газэты, арганізацыя адпаведных ясель, падрыхтоўка вечара і інш.).

Зусім ясна, што правядзенк кай эстафэты павінна быць чана партыйным кіраўніцтвам кі эстафэты патрабуюць зам на агульных сходах калгасьні хам работы з групамі бедна

Толькі пры такіх умовах забясьпечана пасьпяховае пра справаздачна-перавыбарчых большавіцкім разгортваньнем тыкі, з арганізаваным адпора з абраньнем працаздоль

УЗЬНІМЕМ КЛЯСАВУЮ БАЯЗДОЛЬНАСЬЦЬ ДЗЯРЖАПАРАТУ

У адказ на вылазкі інтэрвэнтаў, шкоднікаў і контр-рэвалюцыянэраў—беларускіх нац.-дэмакратаў,—яшчэ шырэй РАЗГАРНЕМ БАРАЦЬБУ ЗА ПАЛЯПШЭНЬНЕ ДЗЯРЖАПАРАТУ

Ператворым саветы зьверху да нізу ў моцную апору дыктатуры пралетарыяту і абароноздольнасьці краіны. Адмятаючы паклёпы права-„лявацкага» блёку, які, сумесна з апартуністамі іншых колераў, расчышчаў глебу для шкодніцкай дзейнасьці Рамзіных і Ларычавых,—разгорнем пад сьцягам бальшавіцкай самакрытыкі бязьлітасную барацьбу з бюракратычнай „самастрахоўкай", з безадказнасьцю, са скажэньнямі клясавай лініі ў рабоце паасобных зьвеньняў савецкага апарату—за далейшае ачышчэньне яго ад клясава-варожых элемэнтаў, за яго сапраўднае паляпшэньне. Асноўны палітычны сэнс кампаніі на перавыбарах саветаў—гэта падняць ролю саветаў у справе правядзеньня палітыкі партыі, у справе ажыцьцяўленьня яе генэральнай лініі

Разгорнем сацспаборніцтва на лепшае правядзеньне перавыбараў

Ударым па апартуністычных адносінах да кампаніі

Першы выбарчы сход

1 сьнежня адбыліся перавыбары сельсавету ў ВЁСЦЫ КАРАВАЕВА, РУДЗЕНСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ, Сьмілавіцкага раёну.

На сходзе рабілі справаздачы старшыня Рудзенскага сельсавету тав. Шахоцька і член сельсавету ад вёскі Караваева тав. Людчык.

У дакладзе і ў спрэчках адзначаны памылкі ў рабоце сельскага савету.

Беднота арганізавана слаба. Самаабкладаньне за 1929-30 год у суме 2.000 руб. не скарыстана. Школы Рудзенскага сельсавету не адрамантаваны. За 1930-31 год трэба было спагнаць 6.900 руб. самаабкладаньня, а спагнана 2.000 руб. Дарогі—у дрэнным стане.

Дрэнна праведзена падпіска на пазыку «Пяцігодка—за чатыры гады».

З дадатых бакоў работы адзначаны —збор сродкаў на пабудову дырыжабля, арганізацыя новых ячэек Асоавіяхіму ў часе «дэкады абароны» і г. д.

У сельскі савет выбраны 6 чалавек—4 члены і 2 кандыдаты. Выбраны беднякі і калгасьнікі.

У наказе новаму сельсавету прапануецца—рашуча павярнуцца тварам да калектывізацыі, аддаць увагу школьнаму будаўніцтву, выправіць усе дапушчаныя памылкі.

Перавыбары скончыліся ў 4 гадзіны раніцы.

С. Б.

Калгасьнікі пераможна нясуць „савецкую эстафэту"

Багучыцкі сельсавет—першы ў Каралінскім раёне, які па-бальшавіцку разгарнуў работу па ўсіх маршрутах савецкай эстафэты.

Брыгады прыступілі да праверкі работы сельсавету, як ён кіраваў калгасным рухам, як дапамагаў каапэрацыі, праводзіў загатоўкі і г. д.

Насьценгазэта ўзялася за асьвятленьне ходу эстафэты.

Агульны сход калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага сялянства ў адказ шкоднікам пастанавіў перавыканаць пляны загатовак, поўнасьцю ажыцьцявіць мэты савецкай эстафэты і выбраць бальшавіцкі сельсавет.

Сваю заяву багучыцкія калгасьнікі, і беднякі і серадняк ператвараюць у жыцьцё.

Арганізован чырвоны абоз з 50 фурманак, які здаў 50 цэнтн. збожжа. 30 сялянак здалі каапэрацыі 2 цэнтн. ільну-валакна. 30 калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў падпісаліся на газэту «Савецкая Беларусь».

М. Абрамовіч.

Выклік на спаборніцтва

БУДА-КАШАЛЁЎСКАЯ. (Наш кар.). Нядаўна адбыўся агульны сход ячэйкі КП(б)Б з удзелам калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкага актыву, прысьвечаны справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

Ячэйка пастанавіла мабілізаваць усіх членаў партыі і камсамольцаў па правядзеньне перавыбараў.

Неабходна дабіцца поўнага выкананьня ўсіх відаў загатовак і пляну мабілізацыі сродкаў.

Сход выклікаў кашалёўскую ячэйку на сацыялістычнае спаборніцтва па лепшым правядзеньні перавыбараў і 100%-най яўцы выбаршчыкаў на сход.

Па раёне праходзіць зараз савецкая эстафэта. Створаны брыгады па праверы ўсіх галін работы сельсавету.

Заключаны дагавор на лепшае правядзеньне эстафэты з Уваравіцкім райвыканкомам.

С. Новікаў.

Калгасы Гарадоцкага рэёну—у баку ад перавыбараў

Кіруючыя арганізацыі Гарадоцкага раёну недаацэньваюць палітычнага значэньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў. Аб гэтым сьведчыць рад фактаў.

Перавыбары ў горадзе не падрыхтаваны. Прапоўнае насельніцтва ня ведае аб важнейшай кампаніі дня.

Сьпісы незбаўленых выбарчых праў ня вывешаны, няма лёзунгаў і плякатаў. Да кампаніі ня прыцягнуты раённая і насьценгазэты. Райпрафсавет прымае вельмі слабы ўдзел у падрыхтоўцы. Ня даны нават дырэктывы мясцкомам.

Райком ЛКСМБ арганізаваў брыгаду з 12 чалавек для пасылкі на вёску. Брыгада на раён ня выехала, а райком ніякіх мер ня прыняў.

У Вайханскім, Селішчанскім сельсаветах па некаторых насельніцкіх пунктах з-за дрэннай падрыхтоўкі зрываліся справаздачныя сходы.

Многія вясковыя парт'ячэйкі і камсамольскія арганізацыі не разгарнулі работы в батрацтвам і беднатой, слаба ўцягнуты ў кампанію жанчыны, у выніку на сходах прымае ўдзел ня больш 15 проц. жанчын-выбаршчыц.

Пытаньні перавыбараў у калгасах амаль што не абмяркоўваліся. Напрыклад, парт'ячэйка камуны імя Леніна заслухала пытаньне аб перавыбарах саветаў і пастанавіла... «прыняць да ведама». Ніякіх канкрэтных прапаноў ня вынесена.

Камсамольская ячэйка калгасу «Чырвоны сьцяг» адмовілася паставіць на сходзе інфармацыю аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Выбарчыя камісіі ў калгасах бязьдзейнічаюць.

У падрыхтоўцы да справаздачна-перавыбарчай кампаніі наглядаецца апартуністычная недаацэнка перавыбараў. Райком партыі ня прымае рашучых мер, каб ажывіць падрыхтоўку.

Аб апартуністычнай практыцы ў раёне гаворыць і такі факт, што калектывізавана толькі 6 проц. плошчы, прычым за апошні час няма зруху ў калгасным будаўніцтве.

Брыгада: Курган, Шкурдзэ.

Распрацавалі пляны і... супакоіліся

АСТРАШЫЦКІ ГАРАДОК. (Наш кар.). Астрашыцка-Гарадзецкія раённыя арганізацыі не падрыхтаваліся своячасова да справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў. Растлумачальная работа сярод выбаршчыкаў аб значэньні перавыбарчай кампаніі не вялася. Прафсаюзы, намсамол, настаўніцтва прымалі слабы ўдзел у падрыхтоўцы да перавыбараў. Астрашыцка-гарадзецкі МЕСТАЧКОВЫ савет абмежаваўся толькі распрацоўкай пляну перавыбараў. Да выкананьня-ж пляну савет не прыступіў.

У выніку перавыбарчую кампанію па рэёне прышлося адкласьці на 5 дзён, па месцачковым савеце — на тыдзень.

Усім РК КП(б)Б, райпрафсаветам і РКК-РСІ

Вялізарны рост сацыялістычнай індустрыялізацыі, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, якая выклікае жорсткае абвастрэньне клясавай барацьбы — прад'яўляе да ўсяго савецкага апарату і ў прыватнасьці да апарату сувязі цэлы рад важнейшых новых і адказнейшых задач.

Значэньне сувязі яшчэ ў большай меры павялічваецца зараз — пасьля ліквідацыі акруг і пастановы СНК БССР аб перадачы апарату сувязі БССР усёй справы распаўсюджваньня пэрыядычнага друку і пастановы СНК БССР аб пераводзе апарату сувязі на сутачную дзейнасьць.

Правядзеньне агляду дзейнасьці апарату сувязі па БССР у асаблівасьці найбольш слабога яго вучастку — распаўсюджваньня і дастаўкі пэрыядычных выданьняў, праз партыйныя, савецкія, прафэсыянальныя органы, РСІ і грамадзкія арганізацыі і шырокія копы працоўных мас — зьяўляецца своячасовым і неабходным.

Гаспадарка сувязі па распаўсюджваньні і дастаўцы друку і іншых відаў сувязі не адпавядае за тэмпамі рэканструкцыйнага пэрыяду, не адказвае растучым задачам культурнае рэвалюцыі.

Тольні па ўмовах жорсткай самакрытыкі, праз арганізаваны кантроль з боку ўсёй грамадзкасьці, магчыма дабіцца сапраўднага пералому ў працы апарату сувязі.

Арганізаваны 3-хмесячны агляд гаспадаркі сувязі павінен падняць усе працоўныя масы і зьявіцца свайго роду ўсебеларускім паходам за паляпшэньне працы гаспадаркі сувязі.

Агляд павінен высьветліць, як ідзе падрыхтоўка кадраў, арабочаньне апарату, якая сувязь маецца з партыйнымі, савецкімі, прафарганізацыямі і працоўнай масай.

Адначасова з аглядам апарату сувязі абвяшчаецца агляд вытворча-эканамічнай працы прафсаюзаў сувязі і яго нізавых ячэек.

Трохмесячнік агляду павінен паказаць, як сапраўды павярнуўся саюз тварам да вытворчасьці, як ён мабілізуе прапановы працаўнікоў, праводзіць іх у жыцьцё, наколькі разьвіта сац. спаборніцтва і ўдарніцтва і становішча вытворчай дысцыпліны.

Усе гэтыя задачы паказваюць на своячасовую неабходнасьць правядзеньня агляду, на яго вялікае культурна-палітычнае значэньне. Але-ж выніку гэтага агляду будуць залежаць ад актыўнага ўдзелу з боку партыйных, прафэсыянальных арганізацый і органаў РСІ, а таксама рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі.

Таму Культпроп ЦК КП(б)Б, НК РСІ і ЦСПСБ прапануе ўсім РК КП(б)Б, райпрафсаветам, РСІ і раённаму друку ўключыцца ў працу па агляду на аснове паказаньняў арганізаванага цэнтралізаванага агляду.

Заг. Культпропам ЦК КП(б)Б ЧАРНУШЭВІЧ.
Нам. Старшыні ЦКК і Нарком РСІ ГУРЭВІЧ.
За старшыню ЦСПСБ КАМЭНШТЭЙН.

Стварэньні штаб па аглядзе

Для правядзеньня агляду апарату сувязі БССР створан штаб у складзе старшыні т. Вайсберга (НК РСІ БССР), намесьніка т. Скакальскага (радакцыя газэты «Савецкая Беларусь»), членаў: т. Жалавьнікава (ЦП сувязі), Сергеева (Беларускае Кіраўніцтва Сувязі), Сумалая (Фрунзайскі РК КП(б)Б), Этэйна (Кастрычніцкі РК КП(б)Б), Бройды (рэдакцыя газэты «Рабочий»), Пархімчыка (рэдакцыя газэты «Зьвязда»), Хорыка (рэдакцыя газэты «Белая Вёска»), Дзянісава (рэдакцыя газэты «Чырвоная Зьмена»), Грынштмана (рэдакцыя газэты «Акцябр»). Штаб знаходзіцца пры рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь».

За масавы пралетарскі кантроль над дзяржапаратам

(З ДАКЛАДУ СТАРШЫНІ ЦКК І НАРКОМА РСІ ТАВ. КАЛНІНА НА НАРАДЗЕ САКРАТАРОЎ ПАРТЫЙНЫХ І КАМСАМОЛЬСКІХ ЯЧЭЕК, СТАРШЫНЬ МЯСКОМАЎ, КІРАЎНІКОЎ І РАБКОРАЎ САВЕЦКІХ, ГАСПАДАРЧЫХ І КААПЭРАЦЫЙНА-ГАНДЛЁВЫХ УСТАНОЎ ГОР. МЕНСКУ АД 24 ЛІСТАПАДА)

Гэтую нараду мы склікалі з мэтай абмеркаваць, як працуе савецкі апарат, арабіць поўныя вывады і прыступіць да ліквідацыі тых недахопаў, якія наглядаюцца ў паасобных частках савецкага апарату.

Паклёпы права-„лявацкага" блёку

Лідэры права-«лявацкага» блёку імкнуцца дыскрэдытаваць наш дзяржаўны апарат, дыскрэдытаваць работу нашай партыі па паляпшэньні дзяржаўнага апарату, па яго праверцы і чыстцы.

Група Сырцова — Ламінадзэ наступным чынам характарызуе наш апарат: «Мы правялі чыстку апарату, правялі рад рэарганізацый, а выходзіць, што ён стаў працаваць яшчэ горш. Савецкі апарат не прыстасаваны да задач рэканструкцыйнага пэрыяду».

Ацэнка права-«лявацкага» блёку зьяўляецца зусім хлусьлівай і няправільнай. Такую ацэнку могуць даць толькі ворагі савецкай улады, ворагі дыктатуры пралетарыяту, тыя, хто змагаецца супроць генэральнай лініі партыі.

Робячы паклёп на савецкі апарат — орган пралетарскай дыктатуры, двурушнікі замоўчваюць тую вялізарную работу, якую прарабіла рабочая кляса пад кіраўніцтвам партыі ў змаганьні з бюракратызмам, па патаненьні і спрашчэньні работы апарату, па чыстцы яго ад клясава-чужых, бюракратычных элемэнтаў і замене іх рабочымі-выдуманцамі.

Савецкі апарат з посьпехам выконвае задачы сацыялістычнага будаўніцтва

Наш дзяржаўны апарат, пры ўсіх яго недахопах, мае рад вялікіх дасягненьняў. Аб гэтым сьведчыць выкананьне праграмы сацыялістычнага будаўніцтва, пасьпяховае ажыцьцяўленьне пяцігодкі за чатыры гады, разгорнутае наступленьне на рэшткі капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі. Наш апарат здольны правядзіць дыктатуру пралетарыяту. Тав. Ленін правільна сказаў, што без апарату мы даўно загінулі-б.

Бязумоўна, у нашых установах захаваліся яшчэ ворагі савецкай улады.

Чужыя элемэнты пралезьлі ў дзяржаўны апарат, імкнуцца ўплываць на яго работу, імкнуцца скарыстаць дзяржапарат супроць нас. Аб гэтым гаворыць працэс «прампартыі», члены якое пралезьлі ў пляную і прамысловыя арганізацыі і пад кіраўніцтвам французкага ўраду імкнуліся падарваць абароназдольнасьць Савецкага Саюзу.

Зьнішчым бюракратычныя скажэньні

Чым больш разгортваецца сацыялістычнае наступленьне, тым больш абвастраецца клясавае змаганьне, тым больш адчуваецца супраціўленьне клясава-варожых элемэнтаў, якія імкнуцца павярнуць у свой бок руль дзяржаўнага апарату. Бюракратычныя скажэньні, якія часамі адчуваюцца ў некаторых зьвеньнях дзяржаўнага апарату, зьяўляюцца адзнай з форм клясавага змаганьня капіталістычных элемэнтаў.

Аднак, наш апарат паступова і няўхільна ачышчаецца ад шкодных і чужых элемэнтаў, наш апарат правёў вялікую работу ў галіне ажыцьцяўленьня задач, якія ставяць перад ім партыя і рабочая кляса.

Партыя правяла і праводзіць рад мерапрыемстваў па паляпшэньні работы дзяржаўнага апарату. Чыстка дала магчымасьць рацыяналізаваць работу апарату, ліквідаваць непатрэбныя зьвеньні, узмацніць адказнасьць кожнага з работнікаў, паслаць у апарат вялікую колькасьць рабочых-выдуманцаў, вынаходнікаў, чужых людзей.

Вялікае значэньне ў галіне паляпшэньня апарату набывае шэфства рабочых. Шэфства — адна з важнейшых форм рабочага кантролю над работай апарату. Пры сыстематычным рабочым кантролі мы даб'емся зьнішчэньня скрытага супраціўленьня, бюракратычных скажэньняў у паасобных звеньнях, в боку паасобных работнікаў.

Ударым па самастрахоўцы апарэту

Адно з найбольш важных пытаньняў, на якім я сёньня хачу заваструць увагу нарады — гэта бюракратычная самастрахоўка, якая асабліва дае сябе адчуваць у апошні час. У чым сутнасьць гэтага асаблівага зьявішча.

Кіраўнікі некаторых установаў, каб уникнуць адказнасьці, каб самазастрахавацца пішуць розныя дакладныя запіскі на пяці-пасьці адрасох, абавязкова з адбіткам у РСІ.

ЦКК-РСІ кожны дзень атрымлівае шмат тэлеграм па розных пытаньнях.

Гэтыя тэлеграмы пішуцца не для таго, каб дабіцца вырашэньня пытаньня, а каб сябе застрахаваць ад усякай адказнасьці. «Я, бачыце, паслаў тэлеграму, а паколькі вы нічога не адказалі, г сядзоў і чакаў, пакуль вырашыцце справа».

Беларуская кантора «Сьвінавод» паведамляе Наркамгандлю, Белпалываодсаюзу, Белкаапсаюзу, адбітак — РСІ, аб тым, што бровары трэсту не забясьпечаны бульбай. Паўстае пытаньне — навошта столькі адрасоў, калі ёсьць загатоўшчык, перад якім трэба ставіць пытаньне.

„Мы вам паслалі адбітак"

Белкаапсаюз паведамляе Белмалыжвёласаюзу, Белсельтрэсту, адбітак—ЦКК-РСІ, аб тым, што некаторыя саўгасы і калгасы скарацілі водпуск малака ЦРК. Для чаго-ж пасылаецца адбітак РСІ? Каб вызваліцца ад адказнасьці.

«Сьвінавод» пасылае Белплодагародніне, Наркамгандлю, Дзяржпляну, адбітак—РСІ, адносіну аб тым, каб прыняць меры да загатовак бульбы й адносінах тых саўгасаў, дзе ня было ўраджаю.

Здаецца, «Сьвінавод» павінен ведаць крыніцы, адкуль можна атрымаць гэту бульбу, павінен мець адпаведны плян.

Ільнаканаплянае аб'яднаньне піша Лесбелу, саўгасу імя дзесяцігодзьдзя БССР і, зразумела, (як інакш?) — НК РСІ аб тым, што буда ніцтва зрываецца з-за адсутнасьці лесаматар'ялаў і што ўся адказнасьць падае на Лесбел.

Замест таго, каб самому ўзяцца за спраду, кіраўнік ільна-канаплянага аб'яднаньня т. Лучышын піша саўгасу, Лесбелу і РСІ. Калі-ж НК РСІ пачаў правяраць, чаму ня выканан плян будаўніцтва, яму заявілі: «А мы-ж паслалі вам копію»? Вось адзін з выразных прыкладаў самастрахоўкі.

Менскі цэрабкоп, за подпісам члена праўленьня Бэсэнзона, піша дырэктару цагельні Гандальбуду (і тут не абышлося без адбітку РСІ): «Ня гледзячы на наша папярэджаньне аб ацяпленьні сталоўкі, вамі нічога ня зроблена. Адначасова паведамляю, што ў выпадку зрыву работ або исаваньня Гандуктаў вы будзеце адказваць». Замест таго, каб напісьпуць на Гандальбуд і дабіцца неабходнага, ЦРК займаецца пісаніной. Выходзіць, што і РСІ будзе адказваць за зрыў работы!

Кіраўнік Эльводу т. Віктараў піша прэзыдыуму гарсавету, адбітак—РСІ і ВСНГВ, аб тым, што «ў сувязі з недахватам торфу яму патрэбны дровы і просіць прыняць меры».

Жанглёры паперкамі

ЦКК-РСІ лічыць, што трэба палажыць гэтаму канец.

Трэба навучыцца працаваць тэмпамі, вартымі пэрыяду сацыялістычнай рэканструкцыі, а не займацца пісаньнем адбіткаў, а не ствараць лішні бюракратызым, цяганіну і, між іншым, загружаць нам паштовы апарат.

Людзі, якім даручана адказная работа, імкнуцца скінуць з сябе адказнасьць, у кожным выпадку жанглююць розьнымі паперкамі і шматлікімі адбіткамі. Мэтады самастрахоўкі павінны быць зжыты ў рабоце нашага дзяржаўнага апарату.

Некаторыя ўстановы з-за імкненьня да самастрахоўкі, проста пабіваюць рэкорды бюракратычнага галавацяпства. Бадаканалбуд атрымлівае з Камунбанку грошы, іх аказалася на 10 руб. менш. Адразу пішацца паперка Камунбанку, адбітак—ННК РСІ, з патрабаваньнем дадаць 10 руб.

Для чаго пісалі ў ЦКК-РСІ? Ці не для таго, каб ён разам з Камунбанкам унёс гэтыя 10 руб.?

Ільнаканаплянае аб'яднаньне пасылае адносіну прэзыдыуму гарсавету, адбітак—РСІ, аб тым, што яму патрэбна памяшканьне... Навошта аб гэтым павінен ведаць НК РСІ?

Анкетная „творчасьць" Белсельснабу

Бюракраты завальваюць апарат непатрэбнай перапіскай, прымушаюць арганізацыі чытаць непатрэбныя паперкі, марнуюць дарэмна час. Ці можна дазволіць у далейшым такія зьявішчы? Ні ў якім разе.

А што ў нас робіцца з анкетамі? За апошні час гэта справа апоў прымае агідна бюракратычны характар. У нас не хапае паперы для спіткаў, для друку, а Белсельгасснаб распрацаваў анкеты, адна з 13.000 пытаньняў, а другая в 54.000 пытаньняў. Гэтыя два «томы» павінны быць запоўнены ў 3-х экз. калгасамі і саўгасамі.

На гэтай анкеце адзін з старшынь калгасаў зрабіў наступны надпіс: «Гэта сярэдняе памяж бюракратызмам і шкодніцтвам. За такую агідную творчасьць трэба судзіць». Старшыня калгасу надзвычай метка і правільна ахарактарызаваў бюракратычную творчасьць Белсельгаснабу.

Расьпіска ў бездапаможнасьці

Характэрным відам бюракратызму зьяўляецца таксама перакладваньне сваіх непасрэдных функцый на іншыя ўстановы. Вырэзаны прыклад — ліст кіраўніка Белплодагародніны т. Гейнэ свайму ўпаўнаважанаму ў Бабруйску, адбіткі—ЦКК-РСІ і ДПУ з прапановай ў трохдзённы тэрмін загатовіць і адгрузіць 25 тон морквы. У лісьце пішацца: «органам РСІ і ДПУ прасачыць за выкананьнем». Паведамляецца, што за зрыў забясьпячэньня пралетарскіх цэнтраў справа будзе перадана пракуратуры. Вы ходзіць, што органы ДПУ і РСІ будуць прыцягнуты да адказнасьці, калі бабруйскі ўпаўнаважаны Белплодагароднины не адгрузіць 25 тон морквы.

Рудмэталягандаль зваравацца на завод «Энэргія» па пытаньні аб няправільных узаемных разьліках. Зразумела, ён пасылае адбіткі ліста Дзяржбанку, Мэталятрэсту і НК РСІ. У канцы ліста чорным па белым напісана: «Дзяржбанк і РСІ просім прасачыць за выкананьнем».

БСНГ за подпісам т. Дварэцкага піша матываванае хадайніцтва ў ЦКК-РСІ аб тым, каб апошняя дапамагла пішуць розныя дакладныя запіскі на пяці-пасьці адрасох, абавязкова з адбіткам у РСІ.

ЦКК-РСІ кожны дзень атрымлівае шмат тэлеграм па розных пытаньнях.

Гэтыя тэлеграмы пішуцца не для таго, каб дабіцца вырашэньня пытаньня, а каб сябе застрахаваць ад усякай адказнасьці. «Я, бачыце, паслаў тэлеграму, а паколькі вы нічога не адказалі, г сядзоў і чакаў, пакуль вырашыцце справа».

Беларуская кантора «Сьвінавод» паведамляе Наркамгандлю, Белпалываодсаюзу, Белкаапсаюзу, адбітак — РСІ, аб тым, што бровары трэсту не забясьпечаны бульбай. Паўстае пытаньне — навошта столькі адрасоў, калі ёсьць загатоўшчык, перад якім трэба ставіць пытаньне.

„Мы вам паслалі адбітак"

Белкаапсаюз паведамляе Белмалыжвёласаюзу, Белсельтрэсту, адбітак—ЦКК-РСІ, аб тым, што некаторыя саўгасы і калгасы скарацілі водпуск малака ЦРК. Для чаго-ж пасылаецца адбітак РСІ? Каб вызваліцца ад адказнасьці.

«Сьвінавод» пасылае Белплодагароднине, Наркамгандлю, Дзяржпляну, адбітак—РСІ, адносіну аб тым, каб прыняць меры да загатовак бульбы й адносінах тых саўгасаў, дзе ня было ўраджаю.

Здаецца, «Сьвінавод» павінен ведаць крыніцы, адкуль можна атрымаць гэту бульбу, павінен мець адпаведны плян.

Ільнаканаплянае аб'яднаньне піша Лесбелу, саўгасу імя дзесяцігодзьдзя БССР і, зразумела, (як інакш?) — НК РСІ аб тым, што буда ніцтва зрываецца з-за адсутнасьці лесаматар'ялаў і што ўся адказнасьць падае на Лесбел.

Калі ў далейшым мы будзем сутракацца з такімі зьявішчамі, мы будзем прыцягваць «жанглёраў» паперкамі да суровай адказнасьці.

Правяраць выкананьне дырэктыў

Адным з важных мэтадаў паляпшэньня работы дзяржаўнага апарату зьяўляецца кантроль за выкананьнем дырэктыў партыі і ўраду. Тав. Ленін гаварыў: «правяраць людзей і правяраць фактычнае выкананьне справы — у гэтым, яшчэ раз у гэтым, толькі ў гэтым — цяпер гвоздь усёй работы, усёй палітыкі».

Як настаўлены кантроль і праверка па нашых установах?

Белдзяржкіно даручыла арганізацыю кантролю і праверкі дзеловоду па сумяшчэньні; Менскі цэрабкоп вылучыў на гэту работу інфарматара па сумяшчэньні. ВСНГ даручыў арганізацыю кантролю і праверкі былому дзеловоду. Беларуская Акадэмія Навук усклала кантроль на 17 чал.

І там, дзе вылучана 17 чал., і там, дзе кантралюць дзеловоды — справа ня будзе наладжана. На гэту работу трэба паставіць адказнага работніка, які сапраўды можа арганізоўваць справу, прыцягнуць да не ўсю грамадзкасьць установу.

Больш жывой сувязі, менш „гастр лёрства"

Зараз у сувязі з ліквідацыяй акруг, адна з важнейшых задач — дабіцца паляпшэньня работы раённых арганізацый, палепшыць інструктаваньне, жывую сувязь цэнтру з раёнамі. Нам не патрэбны інструктары-гастралёры, калі інструктар толькі рэгіструецца ў РВК або ў РК. Такіх інструктароў, такіх арганізатараў трэба гнаць з савецкага апарату.

Вось факты. У разгар ліквідацыі акруг НКП, НКАЗ, Галоўдартранс не паслалі на раён, каб арганізаваць работу ні аднаго чалавека.

Белкалгасцэнтр з 14 жніўня па 2 верасьня пасьпеў паслаць у раёны 64 цыркуляры, гэта значыць, кожны дзень па два цыркуляры. Нікуды ня годна такое кіраўніцтва. Цыркулярны паток гаворыць аб тым, што Белкалгасцэнтр не наладзіў жывой сувязі з раёнамі.

„Лятучыя галандцы"

Інспэктар Царкамфіну Вайцаховіч аб'ехаў па пытаньні мабілізацыі сродкаў за 10 дзён Мазырскі, Калінкавіцкі, Жыткавіцкі, Нараўлянскі і Азарыцкі раёны. Ці можна на працягу такога кароткага часу інструктаваць 5 раёнаў? Такое «гастралёрства» пілкай карысьці не дае.

Начальнік адміністрацыйнай часткі НКУС т. Бярэзінскі на працягу 7 дзён аб'ехаў Віцебскі, Аршанскі, Крупскі, Бушынскі, Полацкі і Лепельскі раёны. Што гэта? Інструктаж? Не. Гэта — рэйс «лятучага галандца».

Інструктар Белпаляводсаюзу Аўчыньнікаў прыехаў у Сіроцінскае спажывецкае таварыства ў 4 гадз. дня, а ў 7 гадз. вечара яго ўжо ня было. На такое інструктаваньне дарэмна выкідаюцца грошы. Трэба рашуча змагацца супроць такой работы, дабіцца паляпшэньня інструктаваньня раёнаў.

Адначасова трэба таксама палепшыць паштова-тэлеграфную сувязь з раёнамі. Як працуе наш тэлеграф? Тэлеграма-«маланка» Белкаапсаюзу аб уліку прамтавараў дасьцца ў 10 гадз. вечара 5-га лістапада, а перадаецца на провадзе 6 лістапада ў 11 гадз. раніцы.

Урадавая тэлеграма-«маланка» аб уліку тавараў з Менску да Мазыра ішла 28 гадзін, да Жыткавіч — 43 гадз., да Пятрыкова — 39 гадз., да раёнаў Аршаншчыны — 24 гадз. У той-жа час тэлеграф завален нікому непатрэбнымі тэлеграмамі. Напрыклад, работнікі БКС парамылі выклікаць на сацспаборніцтва ўсе раённыя таварыствы і склалі тэлеграму з сотні слоў.

Абавязкова пасылаюць па тэлеграфу доўтія прывітальныя тэлеграмы, якія можна сьмела пасылаць па пошце.

Арганізаваць пільны рабочы кантроль

Што-ж трэба зрабіць, каб палепшыць наш апарат, каб скончыць з ненармальнасьцямі, якія наглядаюцца?

Важнейшая задача — арганізаваць сыстэматычны, пільны рабочы кантроль над работай дзяржаўнага апарату. Рабочае шэфства прымусіць падцягнуцца нашы апараты, дапаможа змаганьню з цяганінай, самастрахоўкай і безадказнасьцю.

Трэба дабіцца лепшых умоў работы для вылучэнцаў, сьмела высоўваць іх на вышэйшыя пасады, рашуча ачышчаючы апарат ад чыноўнікаў, бюракратаў і шкоднікаў. Наша задача — скончыць чыстку дзяржаўнага і гаспадарчага апаратаў на працягу 1931 г.

Мы павінны дабіцца ўзмацненьня сельсаветаў надзейнымі моцнымі работнікамі, якія маглі-б праяўляць ініцыятыву, якія маглі-б працаваць самастойна, пад кіраўніцтвам РВК, якія былі-б здольны праводзіць генэральную лінію партыі, дабіцца, каб сельсаветы павярнуліся тварам да калектывізацыі.

Адна з важных задач — рацыяналізацыя апарату зьверху да нізу.

Наш апарат вельмі мала ўвагі аддае рацыяналізатарскай рабоце. Парт'ячэйкі ў савецкіх установах мала займаюцца паляпшэньнем дзяржаўнага апарату. Трэба дабіцца, каб кожны супрацоўнік быў сапраўды адказным за даручаную яму работу. Інакш апарат ня зможа выразна працаваць.

Трэба рашуча паставіць пытаньне аб кантролі і праверцы выкананьня. Ва ўсіх установах павінны быць арганізаваны добрыя і моцныя органы кантролю і праверкі.

Неабходна палепшыць работу партыйных, камсамольскіх і прафэсыянальных арганізацый у адносінах змаганьня з бюракратызмам. Гэта задача не толькі РСІ, але ўсёй партыі, усяго камсамолу, усіх членаў прафсаюзу.

У заключэньне т. Калнін падкрэсьлівае, што работа апарату можа быць палепшана толькі на аснове разгортваньня самай шырокай крытыкі і самакрытыкі, рашучага адпору клясава-варожым элемэнтам і іх агентам — апартуністам усіх масьцей.

Перавыбары—баявы вучастак клясавай барацьбы

Мабілізуем масы батракоў, калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкага сялянства для рашучага адпору кулаку. Ачысьцім сельсаветы ад кулацка-нэпманскай агентуры.

Пад знакам бальшавіцкай самакрытыкі саветаў

Справаздачна - перавыбарчая кампанія павінна прайсьці пры шырока-разгорнутай крытыцы і самакрытыцы работы саветаў з боку шырокіх мас рабочых, калгасьнікаў, батракоў, беднякоў і сераднякоў у мэтах выпраўленьня недахопаў у рабоце. Усякія спробы клясава - варожых элемэнтаў скарыстаць самакрытыку ў сваіх мэтах павінны сустрэць рашучы адпор.

Перавыбарчую кампанію неабходна правесьці пад лёзунгам мабілізацыі вакол работы саветаў шырокай грамадзкай думкі пралетарыяту і працоўных мас вёскі, арганізацыі работы з беднатой і батрацтвам, вылучэньня з іх асяродзішча шырокага актыву і новых кадраў. Адна з баявых задач перавыбараў — ачысьціць саветы ад кулацка-варожых элемэнтаў, узмацніць сельсаветы работнікамі, якія магці-б на справе праводзіць генэральную лінію ленінскай партыі.

Матар'ялы інструктарскага аддзелу ЦВК падаюць рад прыкладаў таго, што паасобныя саветы засьмечаны чужым элемэнтам, няздольны справіцца са сваімі задачамі.

«Работа з беднатой не праводзіцца» (матар'ялы абсьледваньня Буда - Кашалёўскага раёну). «Групы беднаты арганізаваны толькі на паперы, частка беднаты пад уплывам кулацтва». (Чарайскі раён).

У сельсаветах Буда - Кашалёўскага раёну работа з беднатой праводзіцца кампанейскім парадкам. Уліку беднаты няма.

Есьць выпадкі, калі паасобныя члены сельсаветаў пягнуцца ў квасьце адсталых пластоў вёскі і ламаюць варожым элемэнтам зрываць палітыка-гаспадарчыя кампаніі на вёсцы (Самахвалавіцкі раён).

У Чарайскім раёне выкрыты моманты скрытага ўціньня клясавай лініі, адводу кулакам лепшай зямлі, засьмечанасьці калгасаў варожым элемэнтам. Нягодкі выпадкі «парадная» работы. Выносьцца пастановы, прымяцоцца рэзалюцыі, але яны застаюцца толькі на паперы.

Усе гэтыя недахопы, у выніку перавыбараў, павінны быць ліквідаваны. Агенты кулацтва павінны быць выгнаны з сельсаветаў.

Посьпех перавыбарчай кампаніі можа быць забясьпечаны толькі пры належным кіраўніцтве партарганізацый, пры ўмове рашучай барацьбы з апартуністамі ўсіх колераў і масьцей.

М. Р.

Апартуністычная недаацэнка работы з беднатой

Парт'ячэйкі і сельсаветы Жыткавіцкага раёну слаба праводзяць масавую работу

Выпадкі парушэньня савецкай дэмакратыі

Масавая работа саветаў Жыткавіцкага раёну праводзілася зусім нездавальняюча. Ні ў адным сельсавеце не працавалі камісіі. Ёсьць сельсаветы, дзе старшыні сакратары ня ведаюць, што павінны працаваць камісіі пры сельсаветах. За весь час райвыканком не даваў ніякіх паказаньняў аб арганізацыі і ажыцьцяўленьні работы камісій.

Культае на абедзьве нагі работа з беднатой. Ні ў адным сельсавеце няма ўліку беднаты. Групы беднаты пры сельсаветах створаны ня ўсюды, там, дзе яны існуюць, работа не ажывацца. Праўда, склікаюцца сходы беднаты, але толькі тады, калі прыяжджае ўпаўнаважаны для правядзеньня тэй ці іншай кампаніі, а таксама калі трэба тэрмінова распрацаваць тое ці іншае пытаньне.

Ні райком, ні вясковыя сельскія ячэйкі на працягу 6-ці месяцаў не дадумаліся склікаць парады і канфэрэнцыі беднаты, хоць яны добра ведаюць, што беднота — апора партыі і рабочай клясы на вёсцы.

Быў выпадак, калі загатоўшчык мяса (б. гандляр) склікаў сход беднаты для абмеркаваньня пытаньня загатовак.

З-за адсутнасьці работы з беднатой актыўнасьць яе не разгорнута. У адным з вёсак Руўня. Ветчынскага сельсавету, на сходзе беднаты па дакладу ўпаўнаважанага ня было задана ніякіх пытаньняў і зусім ня было спрэчак.

Зусім закінута работа з моладзьдзю. Аб гэтым сьведчыць вельмі слабы рост камсамольскай арганізацыі — за апошнія тры месяцы прынята 15 чалавек, выключана 7. Не праводзяцца нарады моладзі.

Наглядаюцца парушэньні савецкай дэмакратыі і грубае адміністраваньне. Вылучаны на пасаду старшыні Ветчынскага сельсавету заводзкі рабочы з-за поўнай адсутнасьці дапамогі ўзьняў халайніцтва ад аслабаненьні яго ад работы і дабіўся пераводу на інш

Голасам клясавай нянавісьці

Твар агентаў інтэрвэнцыі ў абмаўлёўцы Андрэя Александровіча

«Беларуская Асацыяцыя Пралетарскіх Пісьменьнікаў» на пратэсту апошніх год вяла ўпартую, заўзятую барацьбу з праявамі буржуазна - рэакцыйнай і нацыянал - дэмакратычнай ідэалёгіі пасобных пісьменьнікаў. Дробна-буржуазным і антысавецкім нацыянал-дэмакратычным сілам у літаратуры БелАПП увесь час імкнуўся супроцьпастаяць кансалідацыі сіл пралетарскай літаратуры, клясавую выразнасьць і дакладнасьць яе, выкананьне дырэктывы камуністычнай партыі ў галіне літаратуры.

Часопіс пралетарскай літаратуры—«Маладняк» моцна біла па контр - рэвалюцыйных выступленьнях у творчасьці і крытыцы А. Дудара (Глыбоцкага), Ул. Дубоўні, М. Зарэцкага, на абаронах іх, накшталт нацыянал-апартуністаў З. Жыпуновіча, Ф. Купцэвіча і інш.

Але гэтага мала. За артыкульнай бамбардыроўкай павінна была наўхільна ісьці заява «рэдкомі» настаўнікам слова.

Пры тым трэ было змагацца на тольки з ідэалёгамі капіталістычнай рэстаўрацыі — з беларускімі нацыянал-дэмакратамі ў літаратуры, але і з канкрэтнымі носьбітамі яе — з «ворагамі ў доме», з махровымі контр - рэвалюцыянэрамі, беле - эмігрантамі, прыкрытымі да часу маскай лёяльнасьці. Трэ было зрываць маскі!

І кампанія беланаўцы цьвёрда пачаў сваю творчасьць на рэйкі змаганьня з гэтымі сакольнікамі Рамэйных і Калінэнікавых, Лупкевічаў і Астроўскіх.

На перадавой лініі агня тут, бязумоўна, зараз стаіць Андрэй Александровіч.

Яго паэма «Цені на сонцы», напісаная яшчэ ў ліцені 1929 г., сарваўшы фігавы лісьці з мішурнай шчырасьці і сурвазоўшчыка былых адкрытых ворагаў пралетарскай дыктатуры, паказала галярэю прафсаяраў, крытыкаў, всьлапаўцаў, якія «зьмяніці тальнтукі»,

— «Жыцьць, як сьлед,
Жыцьць, прыкрыўшыся
Савецкім добрадушшам»

(«Цені на сонцы», стар. 24).

Гэта — «цені на сонцы», на нашым сонцы будаўніцтва сацыялістычнага грамадзтва.

Нельмі рэальныя, з касьцей і крыві «цені» захаваліся ў нетрах Акадэміі, выдавецтва, наркаматаў...

— Мы карчуем пні,
Пні ў кустох прыцелі».

(Там-жа).

«Прыцелі», каб раней ці пазьней утнуць іржавы нож у сьпіну пралетарскай рэспубліцы, каб прадаваць яе «вурдам і ў гандлёбу чужаземным інтэрвентам». Паэта не намыліўся!

«Генэрал - барона сакратар», «міністар у Скарападзкага па справах нутраных», «прэм'ер-вэтэрынар» — гэта людзі, якія за алоты прадаюць душу і цела, якія рыхтавалі крывавую лазьню рабочым і працоўным сялянам БССР.

Шыат, хто з іх

«Расіцэ заўшты ў расійскім нарадзе,
Выходзіў палякам на польскі парад.

Номер — беларус пры Савецкай уладзе...»

(«Цені на сонцы», стар. 43).

Вось ён, расійскі эсэр, што ва ўмовах акупаванае беланяймкамі Беларусі

«Стаў неадменным
Сябром дофэнзывы.
І
— «З эсэра
расійскага
стаў
беларускім».

(«Цені на сонцы», стар. 67).

Клясавы вораг «помніць свой лёзунг —падхалімах». Пры савецкай уладзе ён пралязае нават у рады КП(б)Б, едзе ў іншы павет; дзе — сьлязьмі, дзе— хабарой дамагаецца ён матар'яльных «благ» і палітычнае роўнавагі.

У вершы «Міністар» («Угрунь, стар. 28) Андрэй Александровіч апавядае пра сум недаўжнага міністра Беларускай Народнай Рэспублікі, які сядзіць у Берліне і ў марах імчыцца на кіраўнічыя вясты у Менск.

«Міністру» далі магчымасьць прыехаць у БССР, бо лічылі:

«...Не зашкодзе
У кожнай хаце іншы цьвік».

Цьвік аказаўся няпэўным. З гэтага «цьвіка» зьявілася вяроўка для працоўных Савецкай Беларусі.

Як вядома, акадэмічная канфэрэнцыя па пытаньні рэформы беларускага правапісу і азбукі ў 1926 г. ператварылася ў дэманстрацыю вазьнічага нацыянал - дэмакратызму. У сымбалічным вершы «Крыўда», прысьвечаным гэтай канфэрэнцыі, Александровіч гаворыць:

— «Сабраліся...
Няма гарутай іскры!
Гатовы выкрасьліць любімае мне «р».
Яны
— «Забыліся!
Забыліся на дзіва...
Ну што-ж!
Як сьцелецца,
Дык так і будзе спаць».

(«Угрунь», стар. 26).

Верш «Падарожжа» бітуе «арэшынска - клюеўскія» настроі ў беларускай паэзіі, носьбітамі якіх часта і зьяўляюцца людзі, варожыя творчаму Сёньня пралетарыяту.

Гэтыя людзі

— «З жыцьцём нясуладзіўшы,
як на чужыне,
накінуўшы вёску сьціраюць асфальт.

Любоў да жыцьця
напрыкметна ў іх стыне,
на вабіць іх заўтрага сьветлая даль.

. . . . . .

Ім не ўдалося
З горадам зжыцца,
Дзіка ім песьня сталёвых машын.
Горад іх давіць, як пылам кастрыца,

Як вёску іх родную горкі палын».

(«Угрунь», стар. 41-42).

Александровіч ведае, што

— «Ня ўсе, што з Рады
ньбеглі за мяжу.
Дзеля праўды
дасяжу.

Іх і ў нас —
не пералічыць

Як сьмуг —
якраз,
глядзяць на нас,
І знойдуць момант
выйсьці з дому —
на вулку —
на барыкады —
супроць савецкае улады».

(«Паэма імя Вызваленьня», стар. 19).

На барыкады ім выйсьці не давядзецца. Жалезная рука ДПУ Беларусі абарвала ініцыятыву інтрыг і змовы. Арганізатары і дапаможнікі інтэрвэнцыі арыштаваны.

У мэту гэтага артыкулу не ўваходзіць ні аналіз фармальна - мастацкіх адзнак і дасягненьняў намянутых твораў Александровіча, ні спышненьне на тых ягo рэчах, дзе ён выводзіць тыпаў клясавага ворагаў па-за межамі БССР («Фабрыка сьмерці», «Паўстанцы» і г. д.).

Характэрна адно, што пасобныя творы беланаўца Андрэя Александровіча ўвогуле правільна і палітычна важка, арыентавані шырокія масы чытачоў у дагалях барацьбы з контр - рэвалюцыйным беларускім нацыянал - дэмакратызмам і шавінізмам.

АНДРЭЙ АЛЕКСАНДРОВІЧ ЗРАБІЎ ВЯЛІКУЮ ПАЛІТЫЧНУЮ ПАМЫЛКУ, ПАДПІСАЎШЫ «ЛІСТ ТРОХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ». Але ён усьвядомілу яе, на-бальшавіцку прызнаў і выправіў.

Сваёй творчасьцю Александровіч давёў, што нацыянал - дэмакратычным, варожым пралетарыяту плыням, ня ўдасца сьпіхнуць яго з правільнага шляху беларускай пралетарскай літаратуры.

Верш Александровіча ў неравазкай бодзьпасьці — заклік да змаганьня, заклік да будаўніцтва, баявыя песьні пераможнага пралетарыяту.

Юр. ЛЯВОНЧЫ.

Па Савецкай Беларусі

Пашырэньне сеткі рабфакаў

Прэзыдыум Дзяржпляну ўнёс на зацьвярджэньне СНК БССР праект павялічэньня сеткі рабфакаў і перадачы іх адпаведным ведамствам.

У Горках, апрача існуючага, будзе арганізавана яшчэ адзін дзенны рабфак. Рабфакі будуць прымацаваны да с.-г. Акадэміі і да зоатэхнічнага інстытуту.

У Менску, апрача існуючага, арганізуюцца яшчэ тры дзенныя рабфакі. Рабфакі будуць прымацаваны да хэміка-тэхналёгічнага і будаўнічага інстытутаў, пэдфаку і наргасу.

Гомельскі рабфак прымацоўваецца да мэханічнага інстытуту. Акрамя таго, у Гомелі будуць арганізаваны рабфакі пры дзясным і пэдагагічным інстытутах.

У Віцебску арганізуюцца рабфакі пры пэдагагічным і ветэрынарным інстытутах. Барысаўскі рабфак прымацоўваецца да мэдінстытуту. Бабруйскі — да наргасу. У Магілеве будзе арганізавана дзенны рабфак пры мясцовым пэдінстытуце.

Праект прадугледжвае пашырэньне і сеткі вячэрніх рабфакаў, якія таксама будуць прымацаваны да ВНУ. У Менску будзе арганізавана 3 вячэрніх рабфакі, у Віцебску, Гомелі і Магілеве—па 2. Перадача ўсіх рабфакаў адпаведным ведамствам павінна быць скончана не пазьней 20 сьнежня.

Аўтамабіль—за 50 кап.

БАБРУЙСК. (Наш кар.). Рабочы пабудовы новага маста ў Бабруйску член Аўтадору тав. **ГАЎРЫЛАЎ** выйграў у апошнім тыражы лётарэі Аўтадору **легкавы аўтамабіль** фірмы «Форд».

Вылазка клясавага ворага
Паранена актыўная рабкорка

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). 2 сьнежня а 8 гадз. увеч. у прамысловай арцелі «Энэргія» паранена рабкорка **Анна Нойдэль.** Нойдэль актыўна выкрывала ў насьценгазэце членаў арцелі **Грынфэльда і Харошына.** Грынфэльд—былы арандатар буйнага млыну «Геркулес».

За некалькі дзён да выпадку Грынфэльд і Харошын награжалі Нойдэль, што адпомсьцяць ёй за заметкі ў насьценгазэце.

Пралетарская грамадзкасьць абурана вылазкай клясавага ворага і патрабуе суровага пакаранья вінаватых.

Пракуратура вядзе тэрміновае сьледзтва. Арыштаваны 3 чалавекі.

Забесьпячэньне будаўніцтва нярудными выкапнямі

Прэзыдыум Дзяржпляну БССР пастанавіў перадаць здабычу і загатоўку простых нярудных выкапняў мясцовага паходжаньня (каменьняў, пяску і інш.) — пока арганізаванаму трэсту «Нярудпіў». Трэст будзе забесьпечваць нярудными выкапнямі прамысловае гарадзкое будаўніцтва БССР.

Канфэрэнцыя фізкультурнікаў

ВІЦЕБСК. (Наш. кар.). Скончылася міжсаюзная гарадзкая канфэрэнцыя фізкультуры. У рабоце канфэрэнцыі прынялі ўдзел 200 дэлегатаў. Канфэрэнцыя заслухала даклад аб далейшых задачах фізкультурнага руху і рапарты прафсаюзных фізкультурных гурткоў аб іх удзеле ў сацнаборніцтве, ударніцтве і суботніках. Абраны новы склад гарадзкога бюро фізкультуры.

На канфэрэнцыі быў адкрыт збор сродкаў на пабудову дырыжаблю.

Паведамленьні

СЁНЬНЯ:

— **Пракуратура рэспублікі** паведамляе, што **нарада** па пытаньні «як пракуратура павінна рэагаваць на газэтныя заметкі», назначаная на 7-XII 30 г., адбудзецца сёньня, у 7 гадз. веч.

— **Клюб навуковых працаўнікоў.** У 20 гадз. — лекцыя т. в. Балабрыскага — «Агульная характарыстыка дыялектматы». Уваход вольны.

— **Навук. асацыяцыя дантароў** пры III МСП. Сход гігіенічнага актыву адбудзецца ў 20 гадз., у памяшк. ін-ту сан. гігіены (Інтэрнацыянальная вул.).

— **Навук. асацыяцыя.** У 19 з пал. гадз. у памяшк. каталёгі фармакалёгіі (буд. мэд. ін-ту, 1-шы паверх) адбудзецца пасяджэньне **фармац. сэктару** навук. асацыяцыі МСП.

— **Клюб камунальнікаў.** У 19 гадз. — агульны сход хатніх работніц МК № 2. Пасьля сходу — кіно.

— **БАН.** У 18 гадз., у памяшк. БАН, пак. № 6 — працяг сэмінару па мэтадалёгіі.

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ

вучняў гарачымі сьнеданьнямі, вопраткай і абуткам

Пастанова СНК БССР

Пры правядзеньні ўсеагульнага навучаньня, побач з пытаньнямі будаўніцтва, рамонту і абсталяваньня школ, свячасовага і поўнага укамплектаваньня школ настаўнікамі, асаблівае значэньне мае забесьпячэньне вучняў абуткам, вопраткаю і гарачымі сьнеданьнямі, у першую чаргу дзяцей рабочых, батракоў, калгасьнікаў і беднаты.

Бяручы над увагу паказанае, Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе:**

1. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам разам з каапэрацыяй і школьнаю грамадзкасьцю арганізаваць не пазьней, як праз месяц, на ўсіх школах выдачу вучням сьнеданьняў.

Забесьпечыць гарачымі сьнеданьнямі ў першую чаргу ня менш 60 проц. усіх вучняў у гарадох Менску, Віцебску, Гомелі і Барысаве, а вучняў у іншых гарадох і савецкіх гаспадарках ня менш 30 проц., за кошт цэнтралізаванага забесьпячэньня.

Іншых вучняў, якія не забесьпечваюцца гарачымі сьнеданьнямі, Народны Камісарыят Гандлю і Белкаапсаюз павінны забесьпечыць у гарадох гарбатай, цукрам і хлебам, а ў вёсцы гарбатай і цукрам.

Даручыць Белкаапсаюзу, Белкалгасцэнтру і Белжылсаюзу арганізаваць для гэтага спэцыяльныя кухні-разьмеркавальнікі пры школах або дастаўку сьнеданьняў з грамадзкіх кухань.

2. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Гандлю, Белкаапсаюзу і Белкалгасцэнтру выдзеліць для гэтага фонды прадуктаў, кухонных і сталовых інвэнтар, а раённым выканаўчым камітэтам і Белкалгасцэнтру правесьці работу па арганізацыі добраахвотнага натуральнага самаабкладаньня насельніцтва і калгасаў, для забесьпячэньня вучняў сьнеданьнямі. Даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю, Белкаапсаюзу і Белкалгасцэнтру даць на гэтым пытаньні ўказаньні сваім нізавым арганізацыям.

3. Для дзяцей-вучняў малазабясьпечаных груп рабочых гарадоў і савецкіх гаспадарак павінна быць адпушчана 15 проц. бясплатных і 15 проц. поўплатных сьнеданьняў, а для дзяцей-вучняў батрацтва і беднаты вёскі 10 проц. бясплатных — за сродкі, прадугледжаныя арт. 4.

4. Прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам і гарадзкім саветам прадугледзець патрэбныя сродкі для забесьпячэньня вучняў сьнеданьнямі, вопраткаю і абуткам у мясцовым бюджэце, а таксама прыцягнуць для гэтай справы сродкі грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый (спажывецкай, сельска-гаспадарчай і жыльлёвай каапэрацыі, прафсаюзаў, таварыстваў узаемадапамогі, чырвонага крыжу, таварыстваў «Прыхільнік дзяцей», «Прэч непісьменнасьць» і інш.) і больш разгарнуць работу для прыцягненьня для гэтай справы сродкаў насельніцтва. З усіх паказаных адлічэньняў Асьветы.

Прапанаваць усім цэнтральным гаспадарчым і грамадзкім арганізацыям даць аб гэтым указаньні сваім органам.

5. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы на узгадненьні з Народным Камісарыятам Фінансаў і адпаведным Камісарыятам арганізацыямі не пазьней, як праз 5 дзён, выдаць інструкцыю аб парадку адпушчаньня сродкаў і аплаты сьнеданьняў.

6. Абавязаць Народны Камісарыят Гандлю і Белкаапсаюз даць указаньні сваім органам аб замацаваньні не пазьней, як праз дэкаду, за дзясьцьмі школьнага ўзросту ўсяго цёплага верхняга дзіцячага адзеньня і абутку, разьмеркаваўшы яго (адзеньне) па школах для забесьпячэньня ў першую чаргу дзяцей рабочых, беднаты і калгасьнікаў.

На парадку дзённага лютага месяцаў вылучыць для дзяцей найменш забясьпечанага насельніцтва ня менш 200 тысяч пар дзіцячага абутку (125 тысяч у сьн пар дзіцячага абутку (125 тысяч у лістападзе і сьнежні і 75 тыс. пар абутку ў студзені і лютым). Адпачасова ўжыць усе захады да поўнага забясьпячэньня ўсіх вучняў абуткам.

Народны Камісарыят Гандлю і Белкаапсаюз разам з Народным Камісарыятам Асьветы павінны разьмеркаваць гэту колькасьць па раёнах і гарадох.

7. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Асьветы разам з Народным Камісарыятам Гандлю, Белкаапсаюзам і Белкалгасцэнтрам не пазьней, як праз дэкаду, даць указаньні мясцом аб парадку разьмеркаваньня і скарыстаньня адпушчаных школам прадуктаў харчаваньня, абутку і вопраткі, маючы на ўвазе, што да гэтай справы павінна быць прыцягнута школьная грамадзкасьць (камітэты дапамогі і інш).

8. Даручыць ВСНГ даць тэрміновае ўказаньні адпаведным заводам і фабрыкам аб павялічэньні вырабу дзіцячага абутку і вопраткі. Ускласьці на ВСНГ адказнасьць за свячасовае выкананьне заказаў Народнага Камісарыяту Гандлю і Белкаапсаюзу на дзіцячую вопратку і абутак.

9. Прапанаваць ВСНГ і Белкаапсаюзу вылучыць спэцыяльныя майстэрні для рамонту і вырабу дзіцячага абутку і вопраткі.

10. Каб на было адсеву ў школах з прычыны далёкай адлегласьці школы, даручыць Народнаму Камісарыяту Асьветы разам з Белкалгасцэнтрам распрацаваць пытаньне аб арганізацыі перавозкі дзяцей у школы, асабліва ў зімовы час. Прапанаваць адпаведным гарадзкім саветам і раённым выканаўчым камітэтам устанавіць для вучняў льготны тарыф на праезд у аўтобусах і трамваях (са скідкай ня менш 50 проц.).

11. Прызнаць патрэбным павялічыць асыгнаваньні на дапамогу вучням—дзецям беднаты ў мясцовым бюджэце на 1931 год ня менш, як на 25 проц.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР М. КАЛЕВІЧ.

28 лістапада 1930 году.
гор. Менск.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Пастанова

Савету Народных Камісараў Саюзу ССР

аб завяршэньні разьліноў па ліквідацыі ўзаемнай запазычанасьці ўнутры аграмаджанага сэктару ў сувязі з крэдытнай рэформай.

Разьлікі намік гаспадарчымі арганізацыямі па ліквідацыі ўзаемнай запазычанасьці ў парадку пастаноў Савету Народных Камісараў Саюзу ССР ад 26 ліпеня і 21 жніўня 1930 году ў поўнай мерэ ня скончаны да гэтага часу.

Прызнаючы бязумоўна необходным ачышчэньне балянсаў прадпрыемстваў да пачатку надыходзячага гаспадарчага году, Савет Народных Камісараў Саюзу ССР **пастанаўляе:**

1. Крэдыторы, якія не прад'явілі ў прадугледжаным пастановай савету народных камісараў Саюзу ССР ад 26 ліпеня 1930 году («Збор зак. Саюзу ССР» 1930 г., № 37, арт. 406) тэрміны запатрабаваньняў да даўжнікоў аб пагашэньні заваёчанасьці або іскаў аб спагнаньні спрэчных сум, могуць прад'явіць іскі ў арбітражныя камісіі да 15 сьнежня 1930 г.

2. Даўжнікі, якія не заявілі па ўстаноўленыя тэрміны сваіх пярэчаньняў супроць патрабаваньняў крэдытораў, могуць да 10 сьнежня 1930 г. прад'явіць у арбітражныя камісіі іскі аб зваротным пералічэньні сум, зьнятых з іх кантакарэнтных рахункаў.

3. Справы па ісках, пакінутых арбітражнымі камісіямі без разгляду на фармальных падставах (пропуск тэрміну, неўнясьненьне адзінай дзяржаўнай пошлины і г. д.), павінны быць разгледжаны па сутнасьці, калі да 10 сьнежня 1930 году зацікаўленым бокам будзе надана заява аб гэтым у арбітражную камісію.

4. Прад'яўленьне іскаў (арт. арт 1 і 2) і падача заяў (арт. 3) дапускаецца толькі ў выпадку, калі іскавая сума перавышае 5.000 рублёў.

Разгляд арбітражнымі камісіямі ўсіх спраў, якія паступілі ў парадку гэтай пастановы, а таксама пастановы Савету Народных Камісараў Саюзу ССР ад 26 ліпеня 1930 году, павінен быць скончан не пазьней 10 студзеня 1931 г.

6. Абавязаць дзяржаўны банк Саюзу ССР не пазьней 20 студзеня 1931 году правесьці пералічэньні з кантакарэнтных рахункаў крэдыторам і даўжнікоў на аснове пастаноў арбітражных камісій.

7. Абавязаць арбітражную камісію пры СНА прадстаўляць у Савет працы і абароны раз у 10 дзён даклады аб ходзе разгляду спраў з наведамленьнем копій дакладаў Дзяржаўнаму банку Саюзу ССР.

8. Гэта пастанова уводзіцца ў моц па радыё.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў Саюзу ССР. В. ШМІДТ.
Нам. кір. справамі Савету Народных Камісараў Саюзу ССР і Савету працы і абароны І. МІРОШНІКАЎ.

Масква, Крэмль, 29 лістапада 1930 г.

Што трэба ведаць пра лябу ??? 3

КЛЮБ імя КАРЛА МАРКСА
Для членаў прафсаюзу
ПАНЯДЗЕЛАК, 8 СЬНЕЖНЯ, АЎТОРАК, 9 СЬНЕЖНЯ
вечар камернай песьні
Вядомая сьпявачка
Верс ДУХОЎСКАЯ (МАСКВА) | М. БІХТЭР (ЛЕНІНГРАД)
У праграме: МУСОРСКІ, РЫМСКІ-КАРСАКОЎ, фрагмэнты з опэр і рамансы.
Білеты продаюцца выключна праз тэатр. рабочую касу штодзённа з 5 сьнежня ад 12 да 2 і ад 4 да 6 гадз., а ў дзень канцэрту ад 6 гадз. у клюбе Карла Маркса.
УВАГА: Па калектыўных заўках фабзаўкомаў і мясцкомаў у колькасьці ня менш 20 білетаў дасцца **скідка 25 проц.**
ПАЧАТАК КАНЦЭРТУ ў 8 г. 30 м.
Адказны распрад. БЕЛ. АДДЗ. САФІЯУ.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Ад панядзелка, 8-га сьнежня,
па прычыне вялікага посьпеху
2-гі тыдзень пастаноўкі 2-гі
гістарычны фільм
ПАЛОНЬНІК КАЎКАЗУ
(М. Ю. Лермантаў).
Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз.
КАСА—ад 4 г. 30 мін.

Кіно „ЮНЫ ПІОНЭР"
Гістарычны фільм
Тарас Шаўчэнка
2-я серыя.
Пачатак 1-га сэансу ў 1 гадз. дня
Каса—з 11 гадз. 30 м.

Кіно „СПАРТАК"
Ад панядзелка, 8 сьнежня
на экране ІГАР ІЛЬІНСКІ
у фільме ПРАЦЭС АБ 3.000.000
Камедыя ў 6 частках.
УВАГА! Штодзённа 4 сэансы.
ПАЧАТАК 1-га сэансу ў 6 г., 2-га с.—7 г. 30 м., 3-га с.—9 г., 4-га с.—10 г. 30 м.
КАСА—а 4 г. 30 м.

1-ая ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ
менскага таварыства
„ПРЫХІЛЬНІКІ ДЗЯЦЕЙ"
адбудзецца ў аўтораку, 10 сьнежня, у 7 гадз. веч. у памяшканьні клюбу гарсавету (вул. Волі).
Мандаты делегатам на канфэрэнцыю выдаюцца ў праўленьні т-ва 9 сьнежня з 10 гадз. раніцы да 8 гадз. веч.
Посьпідзньне францыі адбудзецца 10 сьнежня, там-жа ў 6 гадз. веч.

Гукавы кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
АД ПАНЯДЗЕЛКА, 8-га СЬНЕЖНЯ 1930 г.
ПАДВОЙНАЯ ПРАГРАМА
1. Выдатны мастацкі нямы фільм вытворч. САЮЗКІНО
„СОННАЯ КРАСУНЯ"
кіно-п'еса ў 5-ці частках.
Рэжысэры браты Васільевы. Аператар Я. Шнайдэр.
Мастак І. Махліс.
У дзельнічаюць акторы: Сімонаў, Вітаўтаў, Чувелёў, Ал-кесаў, Дзйчанка, Ігнацьцеў, і інш.
КАРЦІНА ІЛЮСТРУЕЦЦА СТРУННЫМ АРКЕСТРАМ.
2. ГУКАВЫ ФІЛЬМ
КАНЦЭРТ ВЯДОМЫХ АРТЫСТЫХ
БАРОЎСКАЙ (каляр.-сапрано) і ЧАРАВА (тэнар).
Кожны дзень 3 сэансы. Пачатак а 6 з пал., 8 з пал. і 10 з пал. г. увеч.
Каса адкрыта ад 5 гадз. вечару.
Папярэдні продаж білетаў па калектыўных заўках са скіднай у 25 проц. праводзіцца штодзённа ў тэатральнай рабочай касе ад 12 да 2 і ад 4 да 6 гадз. вечару, а таксама ў касе кіно-тэатру ад 5 г.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"
Сёньня | Сёньня
НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
ВЫТВОРЧАСЬЦІ БЕЛДЗЯРЖКІНО
АЛЕСЯ
Рэжысэр А. Хахлова
У гал. ролях: Сапожнікава, Ільлін, Вядзенскі
ЭПІЗОДЫ:
1. Невядомая грамадзянка
2. Хутная дапамога.
3. Ад кого дзіця.
4. У аўгусьвым судзе.
5. Сьведка забойства.
6. Забойца знойдзен.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ:
5-ы ДЗЕНЬ АДПАЧЫНКУ
ШТОДЗЕННА 4 СЭАНСЫ: пачатак 1-га сэансу ў 6 гадз., 2-га — 7 гадз. 30 хв., 3-га — 9 г., 4-га — 10 г. 30 хв.
— Каса адкрыта з 4 гадз. —

МІЦРК
Прадстаўнікі німецкіх навуковых саўгасаў і навукова-дасьледчых інстытутаў
ПАВІННЫ
Ў 3-х ДЗЕННЫ ТЭРМІН
зьявіцца ў штаб па перарэгістрацыі набораных кніжак, каб дагаварыцца аб дні праведзеньня перарэгістрацыі на месцы.
Саўгасы: „Лекерт", „Мыра, Транспартнік", „Сапжан", „Вольная Праца і „Новы Сьвет".
Навукова-дасьледчыя інстытуты: расьлінаводзкая станцыя, бульбяная станцыя, балотная станцыя, сьвінаводчая станцыя і Курасоўчыная.
Праўленьне МЦРК.

МІЦРК
Усе рабочыя і служачыя, якія працуюць у Менску і жывуць на ў горадзе, праходзяць перарэгістрацыю набораных кніжак з 9 да 12 сьнежня
Ў НАСТУПНЫХ ПУНКТАХ:
1) Клюб Леніна, супроць пасажырскай станцыі.
2) Крама № 20 МЦРК, рог плошчы Волі і Ковэма-Дзяржаўскай.
При перарэгістрацыі неабходна мець з сабой наступныя дакументы: 1) справку аб сталым месцы работы і выконваемай рабоце; 2) прафсаюзны білет; 3) справку аб месцы праживаньня; 4) справку аб зьяўцці в вуючу і забесьпечэньні адпаведнага райсхаўв. т-ва («Зямляроба»).
Праўленьне МЦРК.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА"
Ад панядзелка, 8 сьнежня
МАСТАЦКІ ФІЛЬМ
Рэжысэр А. Довжанка
„ЗЯМЛЯ"
Аператар Д. Дэмуцкі
Лепшыя водгукі прэсы.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ: КІНО-ХРОНІКА САЮЗКІНО
ПРАЦЭС ШКОДНІКАЎ („Прамартыя").
ПАСЬЛЯ КОЖНАГА СЭАНСУ
КАНЦЭРТ
Ул. І. ГАЛІН — аўтар сацыяльна-сатыры і лепшы выканаўца песьняк Беранжэ.
ДЭЛЯР І ВІЛЬЯМС — амэрыканскія танцы.
Пачатак сэансаў а 7 г., 8 г. 40 мін. і 10 г. 20 мін.
Каса адчынена ад 5 гадз.
Тых, хто спазьніліся, на сэанс не дапускаюцца.

З 1 па 15 сьнежня г. г. праводзіцца
ЗІМОВЫ НАБОР У ВЯЧЭРНІЯ РАБОЧЫЯ ШКОЛЫ.
Усе рабочыя і служачыя гор. Менску і працоўнае сялянства прыгарадняй лініі, якія за гэтага часу не наведваюць школ і жадаюць паглыбіць сваю асьвету, павінны на працягу паказанага часу падаць заявы аб залічэньні іх у школы па адрасе:
Міхайлаўская, № 4, школа № 1.
Інтэрнацыянальная № 31, школа № 2.
Савецкая, 44, » № 3.
Камунальная, 32, » № 3 (I ступень з 15-XII пераводзіцца на пазьменную працу).
Падгорная, 8, » № 4
Энгельса, 8, » № 5 (працуе пазьменна на яўрэйскай мове).
Герцэна, 4, » № 5 (I ступень працуе на яўрэйскай мове).
Рэвалюцыйная, 22, » № 6 (працуе на яўрэйскай мове).
Рэвалюцыйная, 30, » № 6 (I ступень працуе на яўрэйскай мове).
Камсамольская, 40, » № 7 (працуе на яўрэйскай мове).
Загарадная, 1-14, » № 8 (працуе пазьменна на беларускай мове).
Савецкая, 44, » № 9 (б. чыгуначная).
Вакзальная вул., » № 10 (б. чыгуначная).
Увага: 1) ПРЫЁМ ЗАЯЎ праводзіцца ў памяшканьні школ штодзённа ад 7 да 9 гадз. веч.
2) Школы 2-ой ступені працуюць 16 дзён у месяц: 3, 4, 5, 8, 9, 13, 14, 15, 16, 18, 19, 23, 24, 25, 28 і 29 кожнага месяца, а школы I ступені—15 дзён у месяц у тыя-жа самыя дні, апрача 16-га.

Для здачы НАВЕСТКІ у газэту „ЗЬВЯЗДА" звяраніце па тэл. 7-81

Кошт публікацыі АБ ЗГУБЕ і дакументу 50 к.

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ дастаўкі газэты „ЗЬВЯЗДА" звяраце па тэл. 2-49

ГОСУДАРСТВЕННОЕ ВОЕННОЕ ИЗДАТЕЛЬСТВО
УГРОЗА ИНТЕРВЕНЦИИ И задачи ОБОРОНЫ СССР
ЛИТЕРАТУРА ДЛЯ МАССОВОГО ЧИТАТЕЛЯ
ВЫШЛИ ИЗ ПЕЧАТИ:
БАЗЬ И. Почему мы победили в гражданской войне. Стр. 112. Ц. 28 к.
БАЗЬ И. Угроза войны. Стр. 136. Ц. 45 к.
БЛУМЕНТАЛЬ Ф. Как империалисты готовят войну. Стр. 48. Ц. 12 к.
ВНУКОВ В. Страшна ли нам военная техника. С рис. Изд. 2, перераб. (Биб-ка «На страже СССР»). Стр. 54. Ц. 16 к.
ВОЛОЦКОЙ И. Заводы и пашни в обороне. Изд. 2-е, дополненное. (Биб-ка «На страже СССР»). Стр. 32. Ц. 8 к.
ЗАРЗАР З. Двешь советские дирижабли. Стр. 32. Ц. 8 к.
КОКОРИНА З. Работница, изучай военное дело. (Б-ка «На страже СССР»). Стр. 32. Ц. 8 к.
ЛЕЩИНСКИЙ В. Беседы о военной технике. С 32 рисунк. Стр. 78. Ц. 20 к.
МАХРОВ Н. Техника и Красная армия. С 32 рис. Стр. 64. Ц. 16 к.
НЕГРОБОВ Н. Памятка молодому бойцу. Стр. 39. Ц. 12 к.
РАБИНОВИЧ С. XVI с'езд ВКП(б), оборона страны и Красн. армия. Стр. 64. Ц. 12 к.
СЕМАШКО Н. Дни боевого смотра. Стр. 32. Ц. 5 к.
ВЫХОДИТ ИЗ ПЕЧАТИ НА-ДНЯХ
ХАРИТОНОВ Н. «Промпартия» агент империализма.
ГОТОВЯТСЯ К ПЕЧАТИ:
ГЕНКИН Л. Наши друзья в стане врагов. Изд. 2-е.
ЛАНДА. От первой ко второй интервенции.
НАУМОВ Н. Подготовка интервенции и экономическая блокада СССР.
РАДИОНОВ. Угроза новой интервенции.
Заказы направлять в отд. и магазины КНИГОЦЕНТРА и в «КООПКНИГИ».

9-га сьнежня, ў 6 гадзін вечара ў памяшканьні клюбу працаўсьветы (Камуністычная вул.)
сыліквецца
надзвычайны зьлёт дэлегатак
ФРУНЗАЎСКАГА РАЁНУ
Яўка ўсіх абавязкова і без спазьненьня.

Грудзінаўскай прафшколе жывёлагадоўлі на базе 7-годні.
БЫХАЎСКАГА РАЁНУ, —
патрэбен зоатэхнік
для выкладаньня дысцыпліны жывёлагадоўлі і кіраваньня вытворчай практыкай.
Нагрузка 28-30 гадзін у дэкаду з аплатай 100 р. за 16 гадзін дакладнай нагрузкі. Школа прадастаўляе кватэру з апалам і асьвятленьнем. Выдаткі на праезд аплачвае школа.
Прапановы з росткамі аб сабе адрасаваць: саўгас Грудзінаўка, Быхаўскага раёну, прафшкола жывёлагадоўлі.

ЛЯЧЭБНІЦА МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ УЗАЕМАДАПАМОГІ
Ленінская № 25, побач з 2-м Домам Саветаў
АДКРЫТА ад 9 г. ран. да 9 г. увеч.
Прыем хворых на ўсіх спэцыяльнасьцях.
па ўнутраных, хірургічных, жаночых, вочных, хваробах вуха, горла і носа, скурана-венэрычных, страўніцых, нервовых.
ЭЛЕКТРА-СЬВЕТА-ЛЯЧЭНЬНЕ і КВАРЦ адкрыты з 5—8 гадз. увеч.
РЭНТГЕН (здымкі, прасьвечваньні, лячэньне) адкрыт з 4 г. да 7 г. увеч.
ЗУБНЫ ГАБІНЭТ адкрыт з 9 г. раніцы да 9 г. увеч. штодзённа
КАНСУЛЬТАЦЫЯ ПРОФЭСАРОЎ па ўсіх спэцыяльнасьцях па папярэднім запісе.
Урачэбная дапамога на дому па ўсіх спэцыяльнасьцях. Запіс з 9 г. раніцы да 9 г. увеч.
Прыём хворых па ленавых кніжках на мітэту. Для ўсіх іншых грамадзян—за агульнадаступную дыфэрэнцыяваную плату.

Гал. кантора газ. „ЗЬВЯЗДА"
просіць ішчагародніх падпісчыкаў
ЗДАВАЦЬ ПАДПІСКУ
на газэту „ЗЬВЯЗДА"
сваім бліжэйшым
ПАШТОВЫМ ГАЗЭТНЫМ БЮРО,
а не пасылаць грашовых пераводаў у адрас канторы.
Грошы па пераводах за здаваную раней падпіску просьба накіроўваць непасрэдна у адрас канторы: Менск, Савецкая, 63, галоўная кантора газ. «Зьвязда».

ЦП саюзу саўгандальслужачых
паведамляе, што 8-га сьнежня ў 8 гадз. веч. у памяшканьні клюбу „Саўгандальслужачых" скліканае
АГУЛЬНЫ СХОД ПРАФАКТЫВУ
саюзу СГС г. Менску
з наступным пар